№ 14 (612) 8 красавіка 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Палітбюро-2009

Аляксандр Фядута распачынае цыкл публікацый пра самых уплывовых асобаў з атачэння Аляксандра Лукашэнкі. **Старонка 8.**











### У НУМАРЫ

**Лукашэнка — лідэр на бязрыб'і**

Вынікі свежых сацыялагічных даследаванняў аналізуе Аляксандр Класкоўскі. **Старонка 5.**

**Код 1989**

Часам у гісторыі за год адбываецца болей кардынальных зменаў, чым за папярэднія дзесяцігоддзі. На нашай памяці такім быў год 1989-ы. Піша Віталь Тарас. **Старонка 13.**

**Любанскі сіндром**

Два гады таму на аўтапалігоне Любанскага сельскагаспадарчага ліцэю знайшлі цела навучэнца Сяргея Макарэвіча. З 2003 да 2007 году некалькі ліцэістаў зрабілі сабе смерць. Піша Сямён Печанко. **Старонка 7.**

**Маршруты па Беларусі: Балдук mon amour**

Лынтупшчына — край Блакітных азёр, паганскіх капішчаў, фантастычных краявідаў. І на кожным кроку тут — «французскі след». Піша Павал Касцюкевіч. **Старонка 11.**

# «Будзе час, калі я адкажу на пытанні»



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

заявіў міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў у часе прэс-канферэнцыі **(на фота)**, пасля таго як 5 красавіка яго адправілі ў адстаўку. Афіцыйная трактоўка — праз стан здароўя. **Старонка 3.**

Сказаць, што гэтая падзея стала нечаканасцю, нельга: яе чакалі ўжо даўно. Сваю пасаду Навумаў займаў аж ад верасня 2000 году, калі замяніў на ёй Юрыя Сівакова. Да гэтага ўраджэнец Смаленску Навумаў займаў пасады камандзіра спецыяльнага падраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз», а таксама начальніка службы бяспекі Лукашэнкі.

Паводле адной з версій, адстаўка магла стаць вынікам барацьбы вектараў у атачэнні Аляксандра Лукашэнкі ці ў ім самім. Уладзімір Навумаў быў апошнім з падазраваных у датычнасці да знікнення вядомых апазіцыйных палітыкаў і журналістаў, які займаў высокую публічную пасаду.

Варта адзначыць таксама, што на мінулым тыдні ў інтэрнэце з'явіўся адкрыты ліст на імя міністра ўнутраных справаў нібыта ад яго пlivнадначаленых. У лісце рэзка крытыкавалася праца Навумава. У прыватнасці, там адзначалася: «Сённяшняе жыццё міліцыянтаў — гэта штодзённае адчуванне маральнай непаўнавартасці кожнага міліцыянера, штодзённыя абразы на наш адрас. Вы ставіцеся да нас як да пагалоўя, Вам нецікавыя пабытавыя і матэрыяльныя праблемы ведамства, якое Вы ўзначальваеце». Гэты невядома кім напісаны ліст і мог быць апошняй кропляй у абгрунтаванні адстаўкі. Маўляў, голас народу патрабуе. А міністр дапусціў, каб такое пісалі.

Працяг на старонцы 3.




«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Мар'яну Груздзіловіч аднавілі на працы

**Звольненая раней з філіі брытанскага адукацыйнага цэнтру SOL Minsk настаўніца англійскай мовы Мар'яна Груздзіловіч 7 красавіка зноў выйшла на працу.**

31 сакавіка, калі жанчына прыйшла па канчатковы разлік і працоўную кніжку, галоўны бухгалтар азнаёміў спадарыню Мар'яну з пастановай, паводле якой быў адменены папярэдні загад аб яе звальненні.

Нагадаем, настаўніцу спрабавалі звольніць пасля 25 Сакавіка. Яна адрэагавала на абразлівую рэпліку адной з навучэнак адносна ўдзельнікаў святкавання Дня Волі. Справа Мар'яны Груздзіловіч абудзіла кампанію салідарнасці: на адрас кампаніі SOL і яе мінскага прадстаўніцтва неабыякавыя людзі накіравалі сотні электронных лістоў, пратэстуючы супраць палітычна матываванага звальнення.

**ЗП**

## IN MEMORIAM



## Раіса Жук-Грышкевіч

У чацвер 2 красавіка, на 90-м годзе жыцця, адышла ў лепшы свет вялікая беларуская патрыётка, выдатная жанчына, сябра Рады БНР, др. Раіса Жук-Грышкевіч.

Нарадзілася Раіса Жукоўская ў сведамай беларускай сям'і ў Пружанах. Вучылася ў Беларускай гімназіі ў Вільні, скончыла дантыстыку ў Нямеччыне, але, паколькі еўрапейскія дыпломы ў галіне медыцыны ў Канадзе не прызнаваліся, пасля іміграцыі ў гэтую краіну зноў мусіла ўзяцца за навуку, каб атрымаць права на працу. Расказвала не раз, як цяжка было вучыцца і адначасна зарабляць на хлеб у тыя часы. Тут ужо, у Канадзе, Раіса Жукоўская выйшла замуж за д-ра Вінцука Жук-Грышкевіча, які быў тады Заступнікам Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Міколы Абрамчыка.

Праз шэсцьдзесят гадоў яна працавала на карысць Беларусі. Цягам дванаццаці гадоў, калі муж, др. Вінцук Жук-Грышкевіч, быў старшынём Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, была яна штодзённай супрацоўніцай Старшыні Рады.

Адным з вялікіх здабыццяў Раісы і Вінцука Жук-Грышкевічаў было ўсталяванне Беларускага крыжа на Прошчы Мучанікаў у антарыйскім горадзе Мідланд. Да Крыжа пазней дадаўся Помнік ахвярам камунізму ў Беларусі. Беларусы кожны год бяруць удзел у паломніцтве да Беларускага крыжа ў Мідланд.

Была Раіса Жук-Грышкевіч і прыстойным чалавекам. Для пляменнікаў была яна другой маткай. У яе прыгожай сядзібе праводзілі яны ўсе канікулы. Але і для сяброў быў дом Раісы Жук-Грышкевіч заўсёды адкрыты. Не толькі ўражвала гасціннасць гаспадароў, але і шмат хто прыязджаў нават з замежжа да доктара Раісы лячыцца. Як і ўва ўсім, за што бралася, была Раіса выдатнай дантысткай.

Любіла Раіса мастацтва. Любіла чытаць. «Нашу Ніву» чытала з захапленнем «ад А да Я» да апошніх дзён. Любіла пісаць і вельмі прыгожа пісала. Выдала вялікую кнігу «Жыццё Вінцэнта Жук-Грышкевіча». У рамках Выдавецкага камітэту Згуртавання Беларусаў Канады спрычынілася да выдання двух падручнікаў беларускае мовы аўтарства сястры Валянціны Пашкевіч. Да канца жыцця гэтыя кнігі распаўсюджвала. Вялікім шчасцем былі для Раісы яе два падарожжы ў Беларусь у дзевяностыя гады.

Будзе цяжка для беларусаў Канады прывыкаць да сумнае рэчаіснасці, што Светлай Памяці Раісы ўжо між намі няма. Але ў сэрцах нашых яна будзе прадаўжаць жыць. Светлая ёй памяць!

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады БНР**

## АКЦЫЯ САЛІДАРНАСЦІ ЧЫТАЧОЎ «НН»

### Напішы палітвязням і палітрэкрутам да Вялікадня «Хрыстос уваскрос»

**Зміцер Жалезнічэнка**
в/ч 83469
вул. Ленінградская
247210 г.Жлобін

**Зміцер Бяляеў**
в/ч 41780
вул. Лідская, 5
230003 г.Гродна

**Алесь Каліта**
в/ч 06405
211171 п/а Межыца
Лепельскі р-н

**Юры Дзяшук**
в/ч 5529
2-і Прылуцкі завулак, д.3
220089 г.Мінск

**Франак Вячорка**
в/ч 48694
вул. Астроўскага
247760 г.Мазыр

**Іван Шыла**
в/ч 06405
211172 п/а Межыца
Лепельскі р-н

**Зміцер Хведарук**
в/ч 18662
222169 г.Жодзіна

**Віталь Каратыш**
в/ч 61732
1 дыв., вайсковы гарадок Цэль
Асіповіцкі р-н

**Ігар Салавей**
в/ч 15994
в. Волька
Івацэвіцкі р-н

**Арцём Дубскі**
г.Бабруйск, Першы Пераезны завулак, 10, СІЗА №5,
213826, Магілёўская вобл.,

**Мікалай Аўтуховіч**
вул. Валадарскага, 2, СІЗА №1, камера 14
220050, Мінск

**Юры Лявонаў**
вул. Валадарскага, 2, СІЗА №1, камера 54
220050, Мінск

**Уладзімер Асіпенка**
вул. Валадарскага, 2, СІЗА №1, камера 22
220050, Мінск

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Цана «НН» зніжаецца да 1500 рублёў

Дзякуючы росту накладу «Нашай Нівы» знізіўся сабекошт газеты. Таму ад красавіка газета будзе прадавацца ў кіёсках за **1500 рублёў**. Столькі сама будзе каштаваць цана падпіскі аднаго нумару праз Рэдакцыю. Адпаведна, цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складзе ад красавіка **6000 рублёў**. Цана падпіскі праз «Белпошту» адпаведна знізіцца ад 1 ліпеня.

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак: 

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Касір — Агулам

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак: 

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір — М.П. — Агулам

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Л.Ш.** з Віцебску.
**С.Р., Т.П., Уладзіміру В.** з Гродна.
**Д.К.** з Мастоўскага раёну.
**Ірыне З., А.П.** з Смалявіцкага раёну.
**І.Ш.** з Браслаўскага раёну.
**Валерыю Х., Мікалаю Ш.** з Салігорскага раёну.
**Г.К.** з Мінскага раёну.
**С.Ц.** з Докшыцкага раёну.
**Яўгенію К.** з Шклоўскага раёну.
**Канстанціну Р.** з Свіслацкага раёну.
**Уладзіміру Ш.** з Віцебскага раёну.
**Аляксею Ш.** з Баранавіцкага раёну.
**Антаніне К.** з Крупскага раёну.
**Андрэю М.** з Чашніцкага раёну.

# «Будзе час, калі я адкажу на пытанні»

**Працяг са старонкі 1.**

А яшчэ перад гэтым, у лістападзе летась, была гучная карупцыйная справа, у якую былі ўцягнутыя намеснікі Навумава. Ужо тады крэсла пад міністрам пахіснулася, але Лукашэнка абмежаваўся толькі папярэджаннем на адрас міністра.

Працаў ведамства Навумава людзі былі незадаволеныя ў сувязі з усеагульнай дактыласкапіяй па справе выбуху 4 ліпеня. Дарэчы, МУС так і не падышло да раскрыцця гэтага злачынства. Адзінае, што заявіў Навумаў перад адстаўкай: за выбухам мог стаяць або шаленец-адзіночка, або нейкая таемная арганізацыя. Але не ўдакладніў, што за яна.

За час знаходжання Навумава на пасадзе міністра ведамства неаднаразова запляміла сябе ў барацьбе з іншадумцамі. У 2006 годзе байцы Навумава разагналі Плошчу, тады ж быў арыштаваны Аляксандр Казулін. Міліцыю шматкроць выкарыстоўвалі падчас разгону вулічных акцыяў апазіцыі і для палітычнага застрашвання. Успамінаецца, як Навумаў асабіста камандаваў разгонам мітынгу прадпрымальнікаў 21 студзеня, паказваючы пальцам, каго менавіта трэба затрымаць.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Навумаў усё яшчэ камандуе, але ўжо толькі хакеістамі.**

Цікава, што афіцыйная трактоўка звальнення гучыць «праз стан здароўя». Хаця яшчэ ў пачатку сакавіка на прэс-канферэнцыі да Дня міліцыі Навумаў усур'ёз разважаў пра магчымасць узыходжання на Эверэст. А летась ён здзейсніў стокіламетровую пешую прагулку вакол Нарачы. Па Мінску ён таксама амаль заўсёды гуляў выключна на сваіх дваіх. Толькі ў рэдкіх выпадках скарыстоўваючы транспарт. Як малады, гуляў у хакей.

Гэта не перашкодзіла рэдактару «Советской Белоруссии» Паўлу Якубовічу заявіць у інтэрв'ю радыё «Свабода»: «Насамрэч міністр быў дастаткова хворым чалавекам, і са студзеня разы тры ляжаў у шпіталі, прычым па 10—12 сутак. Так што дзевяць гадоў здароўя не прыбавілі, і таму Уладзімір Уладзіміравіч Навумаў звольніўся. Думаю, што ніякіх наступстваў быць не можа, паколькі да замежнай палітыкі ён увогуле не меў дачынення, і да ўнутранай таксама».

Магчыма, што адбіліся на здароўі праблемы з сном. Навумаў неяк прызнаваўся журналістам, што не можа спакойна спаць, пакуль не раскрые злачынства 4 ліпеня. А яшчэ свой негатыўны адбітак магла зрабіць праца па выходных і святы. Ён таксама расказваў, што не любіць Новы год, бо ў яго немагчыма працаваць. Вось так гараць людзі на працы.

Так супала, што акурат у дзень звальнення Навумава ў Мінску пачынаўся юніёрскі чэмпіянат свету па хакеі ў дывізіёне «В». Журналісты, вядома ж, скарысталі момант, каб задаць былому міністру пытанні адносна яго нага звальнення.

«Я не хацеў бы сёння адказваць на пытанні, не звязаныя з хакеем. Будзе час, калі я адкажу на пытанні, — сказаў У.Навумаў. — Сёння я заняты толькі хакеем. Вы разумееце, наколькі для мяне гэта важна. Напэўна, пройдзе гэты чэмпіянат, і я да вашых паслуг».

Нагадаем, што нават пасля звальнення Навумаў працягвае займаць крэсла старшыні федэрацыі хакею, любімага спорту Лукашэнкі. «Па хакеі, я думаю, усё для мяне будзе вырашацца пасля 15 мая. Я для сябе такую дату паставіў. Я цяпер буду разам з усімі ўдзельнічаць у праекце нашай заяўкі, у выступленні нашай зборнай на чэмпіянаце свету, а потым буду думаць наконт таго, прасіць заставацца ў хакеі або ўсё-такі адпачыць. Па хакейных пытаннях я для сябе яшчэ не вырашыў», — сказаў У.Навумаў.

Дарэчы, своеасаблівае развітанне міністра таксама адбылося на хакеі. У пятніцу падчас уручэння кубку чэмпіёна Беларусі Уладзімір Навумаў выглядаў вельмі змрочна. Звярнула на сябе ўвагу тое, што разам з Навумавым уручаць кубак не выйшаў Лукашэнка, хоць таксама быў на матчы. Напэўна, усё ўжо ведалі пра будучую адстаўку.

Сам Лукашэнка праз пару дзён падчас візіту на Гомельшчыну патлумачыў адстаўку Навумава жахлівай стомленасцю міністра.

Такая адстаўка будзе прыемнай для Еўропы. Навумаў быў апошнім беларускім чыноўнікам са спісу невыязных, які працягваў знаходзіцца на міністэрскай пасадзе.

**Зміцер Панкавец**

# Расійскага ТВ стала трохі менш

**1 красавіка ў Беларусі спынілася трансляцыя шэрагу расійскіх тэлеканалаў. У прыватнасці, кампанія «Космас ТВ» больш не мае ў пакетах сваіх паслуг тэлеканалаў «РЕН ТВ», «Первый канал. Всемирная сеть» і «НТВ–Мир».**

У «Космас ТВ» рашэнне патлумачылі тым, што гэтыя тэлеканалы проста не атрымалі дазвол на далейшае вяшчанне, не паруліліся пра яго загадзя, хаця ўсім даваўся аднолькавы тэрмін тры месяцы. «Некаторыя СМІ каментуюць гэтую сітуацыю як палітычнае рашэнне, але мы так не лічым», — падкрэсліла прадстаўнік кампаніі Алена Клюйкова ў інтэрв'ю агенцтву БелаПАН.

Цікава, што спыненне вяшчання ў Беларусі расійскіх тэлеканалаў супала з нядаўняй перадачай па «РЕН ТВ» «Тыдзень з Марыянай Максімоўскай», у якой быў паказаны сюжэт, прысвечаны асабістаму жыццю Аляксандра Лукашэнкі. Прыкладна ў той самы час на «Первом канале. Всемирная сеть» выйшла праграма «Пражэктарперысхілтан», дзе таксама з'явіўся жарт пра Лукашэнку. Прычым з варыянту праграмы, што трансліравалася тэлеканалам АНТ, яна была выразаная.

Цяпер тэлеканалы «РЕН ТВ», «Первый канал. Всемирная сеть» і «НТВ-Мир» будуць замененыя іншымі, больш лагоднымі, якія не дазваляюць сабе такіх фрывольнасцей у дачыненні да Лукашэнкі, але таксама расійскімі. Напрыклад, «Вести 24 часа», «Мир. СНГ».

Рашэнне прыпыніць трансляцыю папулярных тэлеканалаў выклікала негатыўную рэакцыю пасольства Расіі. «У Расіі не выключаюць ідэалагічнай падставы ў рашэнні беларускага боку адключыць тэлеканалы. Расійскі бок робіць такую выснову з фактаў, якія ва ўсіх перад вачамі. Расійскія тэлеканалы замянілі на расійскія ж, толькі замянілі інфармацыйна-аналітычныя на інфармацыйна-забаўляльныя. Напрыклад, «Россия. Вести 24 часа» кругласутачна гоняць факты, без аналітыкі. А на такіх каналах, як «НТВ-Мир» і «РТР-Планета» нейкія аналітычныя аўтарскія праграмы прысутнічалі», — заявіў супрацоўнік пасольства.

Варта адзначыць, што за апошнія гады вяшчанне расійскіх тэлеканалаў у чыстым выглядзе становіцца даступнае для жыхароў Беларусі толькі праз спадарожнікавую і кабельную тэлевізію. Тэлеканал АНТ замяніў сабой расійскі ОРТ, СТВ — «РЕН ТВ», праз беларускую мадэрацыю праходзяць тэлеканалы НТВ і «Россия». Да апошняга часу ўсім быў даступны толькі ТВЦ, але яго вяшчанне было прыпыненае яшчэ раней.

На сайце afn.by слёзы па забароненых тэлеканалах ліе пракрамлёўскі палітолаг Андрэй Суздальцаў. Ён піша, што Беларусь у явачным парадку выйшла з адзінай з Расіяй інфармацыйнай прасторы, і расійскіх тэлеканалаў у сінявокай больш не засталося.

Вечарам у нядзелю ў сваіх аналітычных праграмах беларускія дзяржаўныя тэлеканалы былі вымушаныя апраўдвацца за такі крок. Яны паведамілі, што гэта ніякая не палітыка, а ўсё абгрунтаванае эканамічнымі інтарэсамі.

Між тым, ні ў адной кабельнай сетцы краіны няма ніводнага беларускамоўнага тэлеканалу.

**ЗП**

# «Чарнобыльскі шлях-2009»: Ад Акадэміі навук да капліцы на Карастаянавай

2 красавіка была пададзена заяўка на правядзенне традыцыйнай жалобнай вулічнай акцыі на 26 красавіка (нядзеля) «Чарнобыльскі шлях».

Яе заяўнікамі сталі прадстаўнікі Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі, Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч, лідэр ПКБ Сяргей Калякін і старшыня АГП Анатоль Лябедзька.

Старшынём аргкамітэту па адзначэнні гадавіны трагедыі ў Мінску стаў Віктар Івашкевіч, у рэгіёнах — Анатоль Лябедзька.

Заяўнікі просяць дазволіць ім акцыю па наступным маршруце: збор а 12:00 на пляцоўцы ля Акадэміі навук, потым шэсце праспектам Незалежнасці да плошчы Якуба Коласа — вуліцы Харужай — Багдановіча — Кульман — перасячэнне Арлоўскай і Карастаянавай. Чарнобыльская капліца стане канчатковым пунктам.

Са словаў намесніка старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, акцыя захавае свой першапачатковы сэнс, але будуць на ёй і палітычныя лозунгі.

**ЗП**

# Моладзь у Малдове дабілася перападліку галасоў



**Еўракамуністы перамаглі на парламенцкіх выбарах у Малдове, але апазіцыя лічыць вынікі нацягнутымі.**

Другое і трэцяе месца занялі праеўрапейскія ліберальныя партыі.

Выбары прайшлі ў нядзелю. Партыя камуністаў Рэспублікі Малдова, якую ўзначальвае прэзідэнт краіны Уладзімір Воронін, набрала 49,9% галасоў.

Правыя Ліберальная і Ліберальна-дэмакратычная партыі — 13% і 12% галасоў, звязаны з Масквой альянс «Наша Малдова» — 9,9%.

Вынікі падліку трохі розняцца ад вынікаў экзіт-полу, паводле якога камуністы набралі толькі 44%.

Камуністы атрымліваюць 59 ці 60 мандатаў з 101 у парламенце. Для абрання прэзідэнта (патрабуецца 61 мандат) ім спатрэбіцца падтрымка прынамсі некалькіх апазіцыйных дэпутатаў. Прэзідэнт Уладзімір Воронін адбыў два тэрміны і паводле канстытуцыі не можа балатавацца на трэці тэрмін.

Усе чатыры партыі, што прайшлі ў новы парламент, выступаюць за паскарэнне інтэграцыі Малдовы ў Еўрасаюз.

Цікава, што Хрысціянска-дэмакратычная народная партыя Малдовы, былы Народны фронт краіны, на гэты раз у парламент не трапіла. Яе электарат не ўспрыняў таго, што яна нефармальна падтрымлівала камуністычны ўрад, і аддаў галасы маладым ліберальным партыям.

Апазіцыйныя партыі млява абвінавачвалі камуністаў у выкарыстанні адміністрацыйнага рэсурсу на выбарах, аднак міжнародныя назіральнікі прызналі выбары свабоднымі. Даволі нечакана, аднак, незадаволенасць камуністамі выплеснулася на вуліцы, і 7 красавіка ўзбунтавалася моладзь. Пад лозунгамі «Далоў камуністаў» і «Жыве ўз'яднанне з Румыніяй» натоўп атакаваў прэзідэнтуру і парламент і захапіў іх. У выніку ўлады вымушаны былі пагадзіцца на перападлік галасоў.

**МБ**



### Вандалы раскапалі Курапаты

У мемарыяльным комплексе Курапаты невядомыя злачынцы раскапалі дзве магілы. Яны выцягнулі парэшткі людзей — косткі, чарапы, вопратку, абутак — і пакінулі іх раскіданымі на жвіры. Вядзецца следства.

**На фота:** археолаг Мікола Крывальцэвіч аглядае парэшткі ахвяраў.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## СЦІСЛА

### За кватэрамі таннеюць хаты й дачы

Падзенне цэнаў проці іх піку ў 2008 годзе склала ўжо да 30%. Рыэлтэры мяркуюць, што гэта яшчэ не дно, і зніжэнне рынку можа працягнуцца аж да моманту аднаўлення крэдытавання.

### Беларусь адмовілася выдаць кс.Бульку

Пра гэта паведаміла пракуратура Ігналінскага раёну Літвы. У адказе, які яна атрымала з Генпракуратуры Беларусі, гаворыцца, што выдача пярэчыла б законам краіны.

Ксёндз Юозас Булька атрымаў беларускае грамадзянства 10 гадоў таму.

У кастрычніку 2008 г. літоўская пракуратура аб'явіла 83-гадовага святара ў еўрапейскі вышук, абвінавачваючы яго ў генацыдзе. Паводле версіі літоўскіх пракурораў, у пачатку 1950-х Ю.Булька супрацоўнічаў з савецкімі ўладамі, дапамагаючы ім высочваць і забіваць партызан, якія ваявалі супраць савецкай улады.

### Аўтобус з партыяй зброі

затрыманы на беларуска-ўкраінскай мяжы. 2 красавіка ў пункце пропуску «Макраны» ў пасажырскім «Ікарусе» ў нішы пад запасное кола знайшлі 15 пісталетаў Макарава з магазінамі, ручны кулямёт Калашнікава калібру 5,45 мм і іншую зброю.

### 10 гадоў, як памёр Карпенка

Ён адышоў раніцай 6 красавіка 1999 году, раптоўна і загадкава. Пасля роспуску парламенту ў лістападзе 1996 году да самай смерці ачольваў «ценявы» ўрад апазіцыі.

**МБ**

## ГАСПАДАРКА СЦІСЛА

### Мясніковіч прапануе рынкавыя рэформы

«Сёння прадукцыі на складах назапасілася на 2 млрд даляраў, а 900 тысяч чалавек працаздольнага насельніцтва нідзе не працуюць і не вучацца», — прызнаў у інтэрв'ю «Інтэрфаксу» патрыярх беларускай наменклатуры, які выконвае функцыі кіраўніка Акадэміі навук. Што рабіць? Мясніковіч прапануе 1) зняць абмежаванні на аплату высокапрадукцыйнай працы,
2) вызваляць цалкам ад падаткаў новастварэныя прадпрыемствы ў праблемных раёнах,
3) стымуляваць куплю беларускіх тавараў у крэдыт. І нават
4) актыўней прадаваць насельніцтву і бізнэсу зямлю. Гэта фактычна праграма рынкавых рэформаў.

### Афшор для вытворцаў легкавых аўтамабіляў на тэрыторыі Беларусі

Аляксандр Лукашэнка 4 красавіка падпісаў указ № 175 «Аб мерах па развіцці вытворчасці легкавых аўтамабіляў». Згодна з ім юрыдычныя асобы, якія заключылі з Міністэрствам прамысловасці пагадненне аб умовах вытворчасці легкавых аўтамабіляў, будуць на працягу трох гадоў вызваленыя ад вылічэння і выплаты падаткаў.

### Беларусь прапанавала ўгоду своп Нямеччыне

Беларусь прапанавала заключыць угоду своп Нямеччыне на ўзор аналагічнай, заключанай у першай палове сакавіка з Кітаем. Расія ад такой прапановы беларусаў пакуль адмовілася.

### Невясёлае лідэрства

Па выніках першага кварталу 2009 году Беларусь стала лідэрам сярод краін былога СССР па тэмпах росту афіцыйнага курсу даляра ЗША да нацыянальнай валюты. Афіцыйны курс даляра ў Беларусі вырас за гэты перыяд на 28,95%, з 2200 да 2837 рублёў.

**МБ**

# Лукашэнка — лідэр на бязрыб'і

**Беларусы не ідэалізуюць тых, хто кіруе краінай, але не ведаюць нікога іншага. Піша Аляксандр Класкоўскі.**

Паспаліты люд натапырыўся. Шок студзеньскай оба-на-дэвальвацыі спарадзіў трывожныя чаканні. 55,5% беларусаў, апытаных сацыёлагамі НІСЭПД у сакавіку, лічаць, што сёлета можа быць яшчэ адна рэзкая дэвальвацыя.

Тая ж, што грымнула 2 студзеня, значна адбілася на матэрыяльным становішчы 45,5% рэспандэнтаў, нязначна закранула 35,4%. Папярэднія заявы ўладаў, што абвалу не будзе, каля дзвюх трацін (64,2%) нашых суайчыннікаў кваліфікуюць як падман. 42,4% пасля гэтага сталі меней давяраць уладам.

Увогуле беларусы, мякка кажучы, не ідэалізуюць тых, хто кіруе краінай.

Адносная бальшыня (37,5%) лічыць, што ў Лукашэнкавым атачэнні — шэрыя, пасіўныя і недастаткова кваліфікаваныя кадры. 43,5% перакананыя, што ва ўладзе — людзі, заклапочаныя выключна ўласным дабрабытам і кар'ерай.

Нарэшце, на першым месцы сярод імаверных прычын стварэння нашумелай Грамадскай кансультацыйнай рады на чале з Макеем, паводле версіі апытаных — жаданне атрымаць чарговы крэдыт МВФ!

Толькі 17,3% беларусаў мяркуюць, што імі кіруе добрая каманда палітыкаў, якая вядзе краіну правільным курсам. Але пры гэтым — вось ён, беларускі парадокс — прыхільнікаў улады болей, чым праціўнікаў: 32,8% супраць 21,6%.

Самай жа вялікай групай нашага грамадства ёсць балота: 38,7% адказалі, што не думалі, да якога з гэтых лагераў сябе прылічыць, і ім гэта абыякава. Карацей, «пафігізм» дамінуе.

Пры гэтым толькі 10,5% з тых, хто верыць у кардынальныя палітычныя перамены цягам наступных пяці гадоў, мяркуюць, што іх здольна ініцыяваць беларуская апазіцыя.

А вось горкая пігулка для энтузіястаў еўрапейскага выбару: толькі 37,1% нашых суайчыннікаў пачуваюцца еўрапейцамі, адмоўны адказ на гэтае пытанне далі аж 52,8%.

Яшчэ адна пігулка для нацыянальна свядомай эліты: 48,6% суайчыннікаў падтрымліваюць стварэнне адзінай з Расіяй сістэмы супрацьпаветранай абароны. Красамоўны і расклад галасоў у пытанні «Як Вы лічыце, ці мусіць Беларусь следам за Расіяй прызнаць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі?». Так — 44,6%, не — толькі 7,7%.

Такім чынам, Лукашэнка, цягнучы рызіну (стала вядома, што ў папярэдні парадак дня вясновай сесіі палаты пытанне аб мяцежных правінцыях Грузіі не ўлучана), фактычна кідае выклік не толькі Крамлю, але і айчыннаму vox populi.

Іншая рэч, што сам гэты «вокс» выразна прарасійскі. Значная частка беларускага грамадства — па-ранейшаму ў ментальным палоне саўка і замбуецца маскоўскімі тэлеканаламі (іх глядзяць 85,6%).

Што да Лукашэнкі, то ягоны электаральны рэйтынг, насуперак прагнозам палітычных праціўнікаў (маўляў, крызіс з дэвальвацыяй адгукнуцца!), ад снежня да сакавіка практычна не пахіснуўся: быў 40,2%, стаў 39,2%.

Феномен адносна высокай падтрымкі яго ў беларускім грамадстве 44,2% апытаных тлумачаць немудрагеліста: «Проста няма нікога іншага, хто быў бы лепшы». Паказальна, што толькі 15,1% матывуюць тэфлонавы рэйтынг нязменнага прэзідэнта ягонымі асабістымі і дзелавымі якасцямі. Яшчэ меней — 13,1% бачаць прычыну ў рэальных поспехах і дасягненнях афіцыйнага кіраўніка.

Такім чынам, мы бачым трыумф ідэалагемы, што ў краіне — адзін палітык. З аднаго боку, беларусы з іх цвяроза-крытычным мысленнем зусім не абагаўляюць Лукашэнку (як і ўсю кіроўную каманду). З іншага боку, за 15 гадоў амаль што палове нашых суграмадзян убілі ў галовы, што выбару няма.

Таму сёння крытычна важна, каб у краіне з'яўляліся хаця б праблескі канкурэнтнай палітыкі. І другое — развіццё недзяржаўных СМІ. Не выпадкова кіроўная вярхоўка так злосна рэагуе нават на рэдукаваныя патрабаванні Еўропы ў гэтых галінах.

Лукашэнка ж, як вынікае з апытання, не цар, не бог і не герой, а проста — лідэр на бязрыб'і. Бязрыб'е ж не таму, што ў нас краіна зломкаў. А таму, што 15 гадоў усе палітычныя альтэрнатывы глушылі тыпова браканьерскімі спосабамі.

## Некаторыя вынікі апытання грамадскае думкі, праведзеныя сацыёлагамі з НІСЭПД.

**1. Ці была дэвальвацыя 2 студзеня нечаканай для Вас?**

| | |
|---|---|
| Была абсалютна нечаканай | 55.2% |
| Я не выключаў, што яна можа быць | 30.9% |
| Я быў пэўны, што дэвальвацыя будзе | 12.5% |
| Няма адказу | 1.4% |

**2. На Ваш погляд, ці магчымая да канца 2009 году яшчэ адна рэзкая дэвальвацыя беларускага рубля?**

| | |
|---|---|
| Так | 55.5% |
| Не | 25.3% |
| Цяжка адказаць \ Няма адказу | 19.2% |

**3. На Ваш погляд, якія прычыны стварэння Грамадска-кансультацыйнае рады? (магчымы больш за адзін адказ)**

| | |
|---|---|
| Каб атрымаць чарговы крэдыт ад Міжнароднага валютнага фонду | 28.7% |
| Ва ўмовах крызісу патрэбны грамадскі дыялог для выпрацоўкі эфектыўных антыкрызісных рашэнняў | 27.0% |
| Каб знізіць сацыяльную напругу ў краіне | 21.9% |
| Іншае | 1.0% |

**4. Як Вы расцанілі б людзей, што цяпер ва ўладзе?**

| | |
|---|---|
| Гэта людзі, заклапочаныя толькі сваім матэрыяльным дабрабытам і кар'ерай | 43.5% |
| Гэта сумленныя, але слабыя людзі, якія не ўмеюць распарадзіцца ўладай і забяспечыць парадак і паслядоўны палітычны курс | 12.7% |
| Гэта сумленныя, але малакампетэнтныя людзі, якія не ведаюць, як вывесці краіну з эканамічнага крызісу | 11.9% |
| Гэта добрая каманда палітыкаў, што вядзе краіну правільным курсам | 17.3% |
| Няма адказу | 14.6% |

**5. Ці адчуваеце Вы сябе еўрапейцам, адчуваеце сваю прыналежнасць да культуры і гісторыі еўрапейскага грамадства?**

| | |
|---|---|
| Так | 37.1% |
| Не | 52.8% |
| Цяжка адказаць \ няма адказу | 10.1% |

**6. Як Вы лічыце, ці павінна Беларусь, следам за Расіяй, прызнаць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі?**

| | |
|---|---|
| Так | 44.6% |
| Не | 7.7% |
| Мне гэта абыякава | 37.1% |
| Цяжка адказаць \ няма адказу | 10.6% |

**7. Калі б заўтра адбыліся выбары прэзідэнта Беларусі, за каго б Вы прагаласавалі? (адкрытае пытанне)**

| | 09'05 | 11'06 | 09'07 | 03'08 | 06'08 | 09'08 | 10'08 | 12'08 | 03'09 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| А. Лукашэнка | 47.3 | 49.7 | 44.9 | 42.5 | 38.9 | 42.5 | 40.6 | 40.2 | 39.2 |
| А. Казулін | 1.8 | 3.5 | 3.2 | 5.2 | 4.8 | 5.2 | 2.9 | 5.0 | 2.3 |
| А. Мілінкевіч | 1.4 | 10.3 | 12.3 | 8.8 | 6.4 | 6.2 | 2.9 | 3.6 | 4.4 |

ЦЫТАТЫ

## «Хто не выконвае задання, павінен быць на вуліцы»

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў павышэння дысцыпліны працы на кожным працоўным месцы: «Хто не выконвае вытворчае заданне кіраўніка, павінен быць на вуліцы. Гэта тычыцца любога працоўнага чалавека».



## «І ЕГУ ўжо як такога няма»



PHOTO.BYMEDIA.NET

Міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў пра вяртанне Еўрапейскага гуманітарнага універсітэту ў Беларусь: «Мы не разглядаем пытанне аб вяртанні ЕГУ ў Мінск. Паводле наяўнай у мяне інфармацыі, увогуле і ЕГУ ўжо як такога няма, таму што ў іх вялікія цяжкасці з фінансаваннем і іншыя фактары».

# Тэст для Абамы і ўсіх людзей Вольнага свету

Запуск ракеты Паўночнай Карэяй ставіць перад Абамам выклік: як абыходзіцца з таталітарнымі рэжымамі. Ад адказу залежаць паводзіны іншых праціўнікаў Захаду.

Праграмны выступ Абамы ў Пражскім Градзе адбыўся адразу пасля запуску Паўночнай Карэяй шматступеньчатай ракеты. Ракета тая на арбіту не вылецела. Гэта не зашкодзіла паўночнакарэйскай прапагандзе цвердзіць, што краіна паспяхова запусціла спадарожнік і ён транслюе гімны ў гонар Кім Ір Сэна і Кім Чэн Іра.

«Гэтая правакацыя пацвярджае, што неабходна дзейнічаць, і не толькі на Радзе Бяспекі ААН, якая адбудзецца сёння. Неабходна рашуча супрацьдзейнічаць распаўсюджванню такіх узбраенняў. Правілы мусяць безумоўна выконвацца. Парушэнні правілаў мусяць безумоўна караца. Прамоўленыя словы не мусяць заставацца толькі словамі», — сказаў Абама ў прысутнасці трыццаці тысяч слухачоў.

Але што ў рэальнасці можа Амерыка? Нанесці нечаканы ўдар па карэйскіх палігонах? Гэта пярэчыла б лініі Абамы на мультылатэралізм і перавагу дыпламатыі перад ваеннымі сродкамі.

Спыніць пастаўкі прадуктаў і паліва ў Карэю? Кімам да гэтага не прывыкаць.

Выбар сродкаў у ЗША насамрэч абмежаваны.

Абама падкрэсліў, што ўсе нацыі павінны аб'яднацца, каб прымусіць карэйцаў змяніць курс. Аднак Кітай ухіліўся ад асуджэння карэйцаў. Расія таксама гандлюецца.

Абама, нібы Гарбачоў у 1980-я, у Празе выступіў з планам вызвалення свету ад атамнай зброі.

План прыгожы — застаецца пытаннем, як пракантраляваць, каб хтосьці потайкі не збудаваў сабе ядзерны арсенал, пакуль іншыя здалі свае на захаванне.

Вольны свет павінен быць моцным, каб свабода выжыла. Такі вывад можна было зрабіць яшчэ ў часы барацьбы з Гітлерам і Сталіным.

Пра рэальную эфектыўнасць абамаўскай палітыкі «мяккай сілы» можна будзе меркаваць у тым ліку па здольнасці Абамы спыніць пакуты карэйскага народу, які ўволю спазнаў радасці жыцця пры таталітарызме.

**Барыс Тумар**

# Дзякуй, «Гомель». Брава, «Юнацтва»

**Што дзеелася вакол лёду на апошнім матчы хакейнага фіналу, апісвае Зміцер Панкавец.**

Які ўсё ж цудоўны фінал быў у сёлетнім чэмпіянаце Беларусі! У ім столькі ўсяго, што і не пералічыш.

Пасля чацвертай гульні серыі мала хто сумняваўся, што «Гомель» стане чэмпіёнам. Пасля ліку 3:1 у нашым першынстве яшчэ ніхто не адыгрываўся. Аж каманда Міхаіла Захарава сабралася ў патрэбны момант і даказала, што ў хакей гуляюць да апошняй хвіліны.

Такая развязка і такая драматургія! Як у галівудскім фільме каманды давялі серыі да заключнай сёмай гульні. Яе пераможца атрымліваў усё. Матч нават перанеслі з цеснага катка ў парку Горкага ў больш прасторны Палац спорту на Нямізе, хоць і давялося там адмяніць адно мерапрыемства.

Толькі паспеў зайсці ўнутр палацу, як сутыкнуўся з праблемай — на месцах, што былі напісаныя на білетах, сядзелі... бээрэсэмаўцы. А вядомы з суду над Аляксандрам Баразенкам актывіст лукамолу Уладзімір Цюхай не пускаў уладальнікаў запаветных квіткоў на законныя месцы.

Маўляў, Мінгарвыканкам забраніраваў іх для БРСМ. Найбольш нахабныя, я ў тым ліку, усё ж сагналі маладзёнаў з месцаў, нягледзячы на ўсе крыкі Цюхая, але ладная частка людзей так і глядзела хакей стоячы, хоць і заплаціла за гэта грошы.

Навошта заганяць на матч моладзь, калі аншлаг усё адно забяспечаны?

Логіку зразумець цяжка. Дарэчы, людзі крайне негатыўна паставіліся да такой ініцыятывы дзяржаўнай моладзі. Нехта ззаду гукаў, што і потым гэтыя людзі будуць сядзець у выканкамах.

Фанаты «Гомелю» да выезду падрыхтаваліся выдатна. Клубныя сцягі (дзяржаўных не было), шалікі, майкі, транспаранты. «За вас уся краіна», было напісана на адным. На іншых былі прозвішчы хакеістаў.

У тым ліку маладога брамніка Ігара Брыкуна.

Менавіта гэты 22-гадовы хлопец і быў галоўнай дзейснай фігурай на лёдзе.

Мінчане ад самага пачатку пайшлі наперад, а «Гомель» стрымліваў атакі і імкнуўся адказаць вострымі контрвыпадамі. Часам, асабліва ў другім перыядзе, вельмі ўдала. Брыкун жа, напэўна, заслужыў на права найлепшага хакеіста сустрэчы.

Дзесьці на восьмай хвіліне першага перыяду ў палацы з'явіўся Аляксандр Лукашэнка. Гледачы віталі яго не надта цёпла.

Дарэчы, сышоў ён адразу пасля фінальнай сірэны, нават не павіншаваўшы хакеістаў з чэмпіёнствам. Фатографы расказалі, што ім была дадзеная строгая каманда кіраўніка краіны не здымаць.

Хвіліны ішлі адна за адной, а шайбы хакеісты не закідвалі. Не дапамагалі нават выдаленні. Градус напружанасці рос з кожнай хвілінай.

Стала зразумела, што лёс сустрэчы вырашыць адна шайба. Так яно і адбылося.

Ужо ў другой палове трэцяга перыяду «Гомель» за парушэнне правілаў застаўся ў меншасці. Не прайшло і дзесяці секунд, як Кітараў змог скарыстацца кольказнай перавагай і адкрыў лік.

...А потым была радасць пераможцаў і смутак пацярпелых паразу. Мінчане падкідвалі на руках Міхаіла Захарава, каманда якога выйграла ў фінальнай серыі 4:3, а Аляксандру Андрыеўскаму толькі і заставалася што супакойваць сваіх хлопцаў. Яны зрабілі ўсё што маглі, але супернік аказаўся крышачку мацнейшым.

Усё ж хакей у Беларусі ёсць. І хакей прыстойнага ўзроўню.

З перамогай, «Юнацтва»!

**Зміцер Панкавец**



# Азаранка ўзнялася на 8-е месца ў рэйтынгу WTA

**Гэтая 19-гадовая светлавалосая тэнісістка з мадэльнай знешнасцю становіцца самай пазнавальнай беларускай у свеце. Вікторыя Азаранка выйграла суперпрадстаўнічы турнір серыі WTA ў амерыканскім Маямі.**

Беларуска Вікторыя Азаранка, што ў мінулую суботу выйграла прэстыжны турнір у Маямі, ўзнялася ў рэйтынгу WTA на восьмае месца (была на 10-м).

Цяпер у Вікторыі 4670 балаў.

Серэна Уільямс захавала за сабой першае месца (у яе 9132 балы), далей ідуць Дзінара Сафіна (8951), Алена Дзяменцева (7561), Елена Янкавіч (7290), Венус Уільямс (7042), Вера Званарова (6720), Ана Іванавіч (5174). Святлана Кузняцова, якую Вікторыя абыграла ва ўпартай барацьбе ў паўфінале, займае дзевяты радок з 4308 баламі.

У чэмпіёнскай гонцы 2009 году Вікторыя наогул чацвёртая з 2290 баламі.

Наперадзе толькі Серэна Уільямс (3450), Вера Званарова (2460) і Алена Дзяменцева (2315). Дзіна Сафіна займае пяты радок, у яе 2051 бал.

**МБ, ЗП**

Вікторыя Азаранка нарадзілася 31 ліпеня 1989 году ў Мінску. Рост — 180 см. Вага — 60 кг. Месца жыхарства: Скотсдэйл (ЗША). Зароблены на турнірах грошы: 2 514 558 даляраў ЗША. Любімая тэнісістка: Штэфі Граф.

**По апошнім снезе аматары экстрэмальнага адпачынку закрылі сезон на гары ля вёскі Якуты (Дзяржынскі раён). На лыжах, сноўбордах, роварах юнакі і дзяўчаты скакалі з трамплінаў і ў ваду (фота ўнізе).**



# Заспелі ля апарату

**На Вілейшчыне спрабуюць выкараніць самагонаварэнне.**

У вёсцы Татараўшчына ўчастковымі інспектарамі міліцыі РАУС быў на гарачым злоўлены самагоншчык, які ў сваёй хаце як раз займаўся вырабам самагонкі. Затрыманы 50-гадовы мужчына, які не мае пастаяннага месца працы, займаўся вырабам самагонкі фактычна на прамысловым узроўні. У парушальніка канфіскавана 35 літраў самагонкі, 3000 літраў брагі, а самагонны апарат знішчаны.

Яшчэ адзін улоў — ля вёскі Казаны. Супрацоўнікамі РАУС у лясным масіве падчас вырабу самагонкі затрыманыя жыхар вёскі Курынец і вілейчук, абодва беспрацоўныя. У іх знойдзена 70 літраў самагонкі, а 2000 літраў брагі і самагонны апарат знішчаныя.

**westki.info**

**З КАМЕНТАРОЎ НА NN.BY**

Брагу і апарат знішчылі, а 70 літраў што? Канфіскавана як рэчдок? :)

# Прысуд вырабнікам гомасэксуальнага порна

**якія ўтрымлівалі сетку порнастудый у Беларусі: ад трох да сямі гадоў турмы.**

Транснацыянальная група (трое грамадзян Беларусі і двое — Расіі) абвінавачваліся ў распаўсюдзе парнаграфічных матэрыялаў у Беларусі. Судзіў іх 2 красавіка суд Ленінскага раёну Мінску. Яны атрымалі ад трох да сямі гадоў турмы.

У порназдымках удзельнічалі каля 50 паўналетніх і непаўналетніх асобаў мужчынскага полу з усіх рэгіёнаў краіны, паведаміла агенцтва «Інтэрфакс-Захад».

## Гэтай справай у свой час займалася салігорская праваабаронца Яня Палякова

# Любанскі сіндром

Два гады таму на аўтапалігоне Любанскага сельгасліцэю знайшлі цела навучэнца Сяргея Макарэвіча. Яго маці два гады беспаспяхова дабіваецца эксгумацыі, бо не верыць у афіцыйную версію смерці сына — самагубства. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, з 2003 па 2007 год шэсць навучэнцаў таго ліцэя зрабілі сабе смерць. Пракурор Любанскага раёну пацвердзіў толькі тры выпадкі, дадаўшы, што між сабой яны не звязаныя.



**Сёлета ў красавіку Сяргею Макарэвічу споўніўся б 21 год.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вера Макарэвіч: «Ордэн маці мала дапамагае».**

### «Няправільна асэнсаваў жыццёвую сітуацыю»

Большасць сем'яў маўкліва прымала трагедыю. Толькі сям'я Макарэвіча ўзялася высвятляць акалічнасці смерці, не даўшы веры афіцыйнай версіі пра самагубства.

Раніцай 7 сакавіка 2007 году на аўтапалігоне Любанскага сельгасліцэю знайшлі павешаным 18-гадовага навучэнца Сяргея Макарэвіча. Як вынікае з матэрыялаў следства, слядоў барацьбы на месцы здарэння не было. Судмедэкспертыза не выявіла ў нябожчыка цялесных пашкоджанняў акрамя странгуляцыйнай баразны на горле ад пятлі. Следства высветліла, што ўвечары 6 сакавіка С.Макарэвіч выпіваў у кампаніі братоў П., у тым ліку ў іх аўто. Пілі двое — Сяргей і адзін з братоў, яго аднагрупнік. Выпіўшы, у інтэрнаце хлопцы запатрабавалі ад малодшых навучэнцаў цыгарэты. Пры гэтым Сяргей нібыта пабіў двух хлопцаў, адзін з якіх уцёк на двор лёгка апрануты. Было гэта апоўначы. Уцякач меў за плячыма няўдалую спробу самагубства, таму шукалі яго вялікай групай разам з выкладчыкамі. Шукаў і Макарэвіч. Сяргей сказаў тады, што ў выпадку чаго ў турму не пойдзе. Раніцай яго знайшлі павешаным. Паводле следства, хлопец не меў ворагаў ні ў Любані, ні ў Салігорску, адкуль прыехаў вучыцца. Справу закрылі, палічыўшы, што «Макарэвіч С.А. здзейсніў самагубства, прычынай якога стала няправільнае асэнсаванне жыццёвай сітуацыі», то бок выпіў, пабіў таварыша, спалохаўся адказнасці і наклаў на сябе рукі.

### «Мой сын хацеў жыць»

«За сорак дзён да таго ў ліцэі здарылася падобнае няшчасце — павесіўся навучэнец. Мы пра гэта з Сяргеем размаўлялі. Ён не мог зразумець, як той мог прынесці такое гора маці», — узгадвае мама Сяргея Вера Васілеўна, уладальніца Ордэну маці (адна выхавала шасцёра дзяцей). Кажа, што сын быў аптымістам, пасля вучобы збіраўся ў войска, хоць мог і не служыць як дзіця з шматдзетнай сям'і. Марыў паступіць у ВНУ на завочнае, знайсці працу, ажаніцца, набыць жытло. «Ён пісаў мне вершы, не даваў пакункі з рынку самой несці», — кажа В. Макарэвіч.

У дзень пахавання на твары хлопца з'явіліся плямы, падобныя да слядоў збіцця (паводле следчых — трупныя плямы), на руцэ родныя заўважылі невялікую рану. На могілках завуч ліцэю сказала, што «калі б не барвовы легкавік, то нічога б не здарылася». Аўто належала братам, з якімі Сяргей быў у той вечар. «Пасля пахавання сябры сына казалі, што яго маглі забіць», — кажа маці. Паводле яе інфармацыі, у той вечар навучэнец уцёк з інтэрнату не праз бойку з Сяргеем, а пасля канфлікту з выхавацелькай інтэрнату. Выхавацелька пацвердзіла гэта камісіі з абласнога аддзелу адукацыі. У матэрыялах следства гэты момант апісаны інакш — сутычка з выхавацелькай была, але пакрыўджаны студэнт вярнуўся ў інтэрнат, дзе натрапіў на п'яных хлопцаў. «У кішэні ў Сяргея знайшлі пачак з цыгарэтамі, то навошта яму было іх у некага адбіраць?» — кажа на гэта В.Макарэвіч.

Родных Сяргея насцярожыла і тое, што вопратка на ім сядзела акуратна, як для чалавека, які, па логіцы, мусіў памерці ў канвульсіях. След ад пятлі, на іх думку, нехарактэрны для добраахвотнага павешання. Пятля, як вынікае з пратаколу, была завязаная досыць слаба. Хлопец быў недастаткова высокі, каб дацягнуцца да кратаў (следчыя не знайшлі пад акном нічога, што магло б дапамагчы яму ў гэтым, а пятля была замацаваная на двухметровай вышыні). Паводле супрацоўніцы моргу, у Сяргея была зламаная рабрына. Следчы нібыта сказаў ёй, што гэта маглі зрабіць пры перавозцы цела. Потым абое ад тых словаў адмовіліся, не было гэта зафіксавана і ў выніковай экспертызе.

Хлопца знайшлі прыхінутым да пабеленай сцяны, каб самастойна завязаць вузел, яму трэба было караскацца па сцяне, але куртка яго была чыстая. «Ён мог і абтрэсціся», — прыводзіць словы следчага В.Макарэвіч. На вопратцы родныя заўважылі сляды крыві, куртка была парваная, на спіне — след ад абутку. Красоўкі чыстыя, хоць у пратаколе агляду месца здарэння напісана, што сляды ад абутку на месцы трагедыі належаць Сяргею. Экспертыза, зладжаная толькі праз дзевяць месяцаў, наяўнасць крыві на вопратцы пацвердзіла, але чыя гэта кроў — дагэтуль невядома.

Сябар Сяргея Т., які дапамагаў адвозіць цела ў морг, казаў, што ў хлопца, калі яго знайшлі, былі сагнутыя рукі. Згодна з пратаколам рукі былі апушчаныя долу. На суд не запрасілі сведак, высновы следства грунтаваліся на паказаннях людзей, якіх родныя Сяргея падазравалі ў датычнасці да яго смерці. Большасць тых, хто сведчыў на карысць Макарэвічаў, потым адмовіліся ад сваіх словаў. Пазней акно ў будынку на палігоне заклалі цэглай, сцены грунтоўна памылі.

### «Шукаць карані трагедый»

У красавіку 2008 году Макарэвічаў наведала здымачная група праграмы «Зона Х». У Любані дырэктар ліцэю Мікалай Краснюк параіў журналістам шукаць карані трагедый не ў навучальнай установе, а ў сем'ях. Маўляў, у большасці выпадкаў няшчасце здаралася праз п'янства бацькоў, неўладкаванасць у побыце. «Можа, у каго і былі праблемы, але не ў нас, — не пагаджаецца В. Макарэвіч. Характарыстыкі, атрыманыя ў школе і ліцэі, напісаныя суседзямі і сябрамі, сведчаць, што Сяргей быў выхаваным, добрым і вясёлым хлопцам. Пісаў вершы, захапляўся беларускай і расійскай літаратурамі, а таксама фізкультурай. Быў прафоргам групы. Медэкспертыза выявіла ў ягонай крыві дозу алкаголю, роўную выпітай пляшцы гарэлкі, а паводле сведак, разам з сабутэльнікам ён выпіў 1,5 літра гарэлкі і столькі ж піва. Маці ж мяркуе, што перад смерцю яе сыну гарэлку маглі ўліць сілай і прыгадвае сляды на ягоным падбароддзі, падобныя на адбіткі пазногцяў, і распухлы нос.



**Каля гэтага будынку ў 2007 годзе знайшлі цела навучэнца.**

### «Следчы ціснуў на мяне»

«Ён моцна любіў маму і сясцёр. Не мог ён такі падарунак ім на 8 сакавіка зрабіць» — не верыць у самагубства Сяргея і ягоная аднакурсніца. Яна ананімна (назавём яе Аленай) распавяла некаторыя падрабязнасці трагедыі, а таксама пра атмасферу, што панавала ў ліцэі. Кажа, што Сяргей не мог адбіраць у кагосьці цыгарэты: «За ўсю вучобу ён толькі аднойчы папрасіў у мяне цыгарэту, а на раніцу вярнуў пазыку». Дзяўчына прыгадвае, што за некалькі тыдняў да трагедыі Сяргея пабіў ягоны аднагрупнік П., той самы, які нібыта выпіваў з ім 6 сакавіка. Паводле следчых, Макарэвіч пабіўся з іншым хлопцам. Алена ўзгадала, што неяк Сяргей спрабаваў, але не здолеў ускараскацца на дах таго будынку на палігоне: «І ён быў цвярозы. А як жа ён змог уначы, моцна выпіўшы, адолець двухметровую вышыню і замацаваць пятлю?»

Праз паўгода на сцяне, пад якой знайшлі Сяргея, нехта напісаў «СМ – ты казёл». Сябры Макарэвіча склалі заяву, у якой выказалі сумнеў наконт прычыны смерці іх сябра. У часе папярэдняга следства большасць адмовілася ад сваіх подпісаў. Алену выклікалі ў пракуратуру неаднойчы. «Следчы ціснуў на мяне — крычаў, патрабаваў адмовіцца ад сваіх словаў, казаў, што кожны дзень хадзіў ля той сцяны і ніякіх надпісаў не заўважаў», — кажа яна.

### «У ліцэі не было дзедаўшчыны»

Са словаў Алены, старэйшыя навучэнцы сваіх перавагаў над малодшымі не дэманстравалі. Куды больш, кажа яна, ліцэісты цярпелі ад некаторых выкладчыкаў і майстроў: «Каторы мог і абляць апошнім словам. Хто вучыцца ў хабзе, той ведае». Паводле яе, у ліцэі было многа навучэнцаў з шматдзетных і небагатых сем'яў.

Алена паступіла ў ліцэй у 2004 г. Ужо тады чула ад старэйшых дзяўчат пра частыя самагубствы сярод ліцэістаў. За час яе вучобы загінулі чацьвёра, да якіх залічылі і Макарэвіча, былі дзве няўдалыя спробы. Паводле інфармацыі, сабранай навучэнцамі, на працягу 2003—2007 г. у ліцэі здарылася шэсць самагубстваў. Любанскі пракурор пацвердзіў тры не звязаныя між сабой выпадкі суіцыдаў.

Пасля смерці Макарэвіча з ліцэю звольнілі шэраг супрацоўнікаў, у тым ліку завуча і выхавацеля. М.Краснюк сваёй пасады пазбыўся нядаўна. Нібыта за тое, што адзін з ліцэістаў папсаваў у горадзе агітацыйны плакат.

### КДБ хадайнічае

Крымінальную справу па факце давядзення С. Макарэвіча да самагубства Любанская пракуратура распачала толькі з чацвёртай спробы пасля хадайніцтваў зверху. У чэрвені 2008 г. справу спынілі. В.Макарэвіч неаднакроць пісала ў Генпракуратуру, КДБ і Адміністрацыю прэзідэнта. Адзін з адказаў, атрыманы з абласной пракуратуры, падпісаны Міхаілам Снегіром. «Мой Ордэн маці мне мала дапамагае», — кажа жанчына. На магіле Сяргея дагэтуль няма помніка, бо яна ўсё чакае дазволу на эксгумацыю цела сына, каб зняць усе сумненні наконт яго смерці. Цяпер з'явілася кволая надзея — з КДБ адказалі, што па выніках уласнай праверкі Камітэт хадайнічаў перад Генпракуратурай аб правядзенні дадатковай праверкі і, пры неабходнасці, эксгумацыі і паўторнай экспертызе.

Гісторыя любанскай вучэльні пакідае пытанні. «Нешта там нядобрае рабілася, можа, якая секта была. Кожны раз у біду траплялі дзеці з ненадзейных сем'яў. І пра мяне, мабыць, думалі, што я шматдзетная, пахаваю сына ды змірыся», — плача В.Макарэвіч. Яна мама і мае права дабівацца праўды.

**Сямён Печанко,**
**Салігорск—Любань—Мінск**

**Аляксандр Фядута распачынае цыкл публікацый пра самых уплывовых асобаў з атачэння Аляксандра Лукашэнкі**

# Палітбюро-2009. Другі твар

8 маладых энэргічных рэвалюцыянераў прымалі найважнейшыя палітычныя рашэнні партыі бальшавікоў пасля яе перамогі ў дзяржаўным перавароце 1917 году.

25 (максімальная колькасць, часам меншая) лядашчых людзей, якія заваявалі ў партыйных інтрыгах права стаць чальцамі найвышэйшага партыйнага кіраўніцтва, вызначалі жыццё Савецкага Саюзу часоў застою.

12 чалавек былі абраныя сябрамі Палітбюро ЦК КПСС на сакавіцкім пленуме 1986 году — тым самым, з якога пачалася перабудова.

Спынімся на гэтай лічбе. Пастановім, што на жыццё суверэннай Рэспублікі Беларусь найболей уплываюць гэтыя 12 чалавек — без уліку кіраўніка беларускай дзяржавы, пастаўленага Канстытуцыяй 1996 году па-за любыя формы палітычнага кантролю — сумленныя выбары з удзелам паўнамоцных назіральнікаў тут не разглядаюцца.

Гэта трэцяя спроба аўтара стварыць карцінную галерэю найвышэйшага кіраўніцтва Беларусі. Самага закрытага кіраўніцтва ў Еўропе. Таму калі партрэт не падобны, як здаецца герою, на яго самога, не дакарайце люстэрка — перачытайце Гогаля. Ціператварайцеся ў паўнавартасныя палітычныя фігуры.

Калі чытачу здаецца, што партрэт грашыць суб'ектывізмам... Ды ўжо даруйце, аўтар не збіраецца ствараць карыкатуры. Што бачыць, тое і малюе.

Час вырашыць.




Кіраўнік Адміністрацыі.

### Іншы твар

Смешна бывае чытаць у маладых беларускіх палітолагаў: «Уладзімір Макей — новы твар рэжыму». Знайшлі новы твар — больш за восем гадоў чалавек працаваў памочнікам прэзідэнта, выконваў ягоныя самыя важныя даручэнні! У апошнія гады фактычна быў галоўным памочнікам.

Можа быць, калегі, слова трэба падбіраць больш дакладна — не «новы», а «іншы» твар. Янус — ён жа двухаблічны. Можа абярнуцца перад вамі вусатым Шэйманам, а можа чырkануць лязом — і вось ён — ліберал Макей!

Хаця Уладзімір Уладзіміравіч наўрад ці можа лічыцца лібералам. Пра ягоныя погляды на эканоміку і прынцыпы кіравання дзяржавай не ведае ніхто. Калі ён і браў слова — то толькі для таго, каб публічна падтрымаць курс, зададзены дзяржаўнаму караблю Аляксандрам Лукашэнкам. Калі і выходзіў з ценю — то толькі для таго, каб выгодна адцяніць тое, што ў дадзены момант неабходна ягонаму вышэйшаму кіраўніку. І нічога болей.

### Функцыянер з прынцыпамі

Ён не палітык — ён дыпламат. Хаця некаторыя кажуць, што ён разведчык. Але гэтая, цалкам прыстойная прафесія, у іх вуснах — накшталт абвінаваўчага акту. А мы, шаноўны чытач, — не суддзі, каб выносіць прысуд. Мы пішам палітычны партрэт і ні на што большае не прэтэндуем. А палітычны партрэт можа быць і ў дыпламата. Калі, канечне, ён працуе памочнікам прэзідэнта альбо міністрам замежных справаў.

> Падчас перадвыбарчай кампаніі 2001 году на экране ў якасці давераных асобаў, каму дазволена было агучыць перадвыбарчую праграму кандыдата Лукашэнкі, апынуліся доктарка Ірына Абельская і дыпламат Уладзімір Макей.

У 2000 г. Уралу Латыпаву спатрэбілася «закрыць вакансію» — прапанаваць кандыдатуру на пасаду памочніка прэзідэнта ў пытаннях міжнароднай палітыкі, спрактыкаваны ў апаратных інтрыгах Латыпаў меў патрэбу ў чалавеку не без прынцыпаў — каб памятаў, каму і чым абавязаны, але і гнуткім — каб не «з'еў» у першы ж год. Яму і прыглянуўся сціплы чыноўнік з МЗС, на якога, як я разумею, Уралу Рамдракавічу ўказаў хтосьці з ягоных старых сяброў — ці не той самы, які з гонарам звярнуў увагу апазіцыйнага журналіста Фядуты на начальніка ўпраўлення агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва МЗСу, калі мы ўсе апынуліся на паўзакрытым семінары ў адным з сталічных банкаў. Ішоў 1999 год.

— Саша, як табе гэты хлопчык з МЗСу?

— Даклад добры, ваша правасхадзіцельства!

— Я табе пра чалавека, а ты мне пра даклад. Тожа мне — інжынер чалавечых душаў!

Даклад сапраўды быў добры. А чалавека ў той момант я не разгледзеў. Імаверна таму, што сам чалавек падчас гэтай першай нашай сустрэчы цалкам адпавядаў грыбаедаўскаму прынцыпу «памяркоўнасці і акуратнасці». Хаця і Грыбаедаў таксама быў дыпламатам.

Разгледзеў чалавека Макея я потым, калі падчас перадвыбарчай кампаніі 2001 году на экране ў якасці давераных асобаў, каму дазволена было (хацелі, імаверна, многія) агучыць перадвыбарчую праграму кандыдата Аляксандра Лукашэнкі, апынуліся доктарка Ірына Абельская і дыпламат Уладзімір Макей — менавіта так гэтыя два персанажы былі прадстаўленыя на экране. Хутчэй за ўсё, і Абельская, і Макей у той момант меней за ўсё былі падобныя да саміх сябе ў рэальным жыцці — у паводзінах, у вымаўленых словах. Але кандыдат выбраў іх — тых дваіх, хто пакуль яшчэ не выклікаў у шырокіх масах працоўных выбаршчыкаў непрымання. У тыя часы Лукашэнка тонка адчуваў падобныя нюансы.

Такі давер дорага каштаваў. Пасля выбараў, калі галоўны ідэйны архітэктар перамогі Урал Латыпаў стаў кіраўніком Адміністрацыі, Макей застаўся на сваёй ранейшай пасадзе. Гэта азначала: даваrае яму не толькі прэзідэнт, але і кіраўнік Адміністрацыі. У апаратных гульнях Макей заставаўся чалавекам з прынцыпамі — іграў, але не зайграваўся, начальства не пакусваў з-за кута. І гэта надавала яму яшчэ больш загадкавасці. Настолькі, што раптоўную адстаўку з пасады вярхоўнага ідэолага краіны непатапляльнага Уладзіміра Замяталіна сталі спісваць на перамоўніцкі талент Макея: маўляў, менавіта сціплы дыпламат здолеў «дажаваць» «чорнага палкоўніка», перакана́ўшы прэзідэнта, наколькі блізкасць таго шкодзіць іміджу кіраўніка беларускай дзяржавы. Хаця як бы яно там ні было насамрэч, толькі прэзідэнт і ведае.

### Выхавацель кронпрынца

Менавіта Макею давяраў Лукашэнка рашэнне самых інтымных задачаў. У тым ліку і самай галоўнай. Калі журналісты дружна пачалі паляваць на Віктара Лукашэнку, які заняў пасаду ў кампаніі, што займалася мабільнай сувяззю. Нервова адрэагаваўшы на такую нечаканую публічнасць старэйшага сына, Лукашэнка-бацька вырашыў схаваць яго, ад граху далей, у Адміністрацыі. Гэта цалкам адпавядала з менталітэту беларусаў.

— Дзе твой сын працуе?

— Ён у мяне памочнік!

Не называйце аднаго з удзельнікаў гэтага дыялогу прэзідэнтам, і вы ўбачыце, паважаны чытач, з якім законным гонарам вымавіў бы гэтыя словы дырэктар любога саўгасу.

Але памочніка прэзідэнта трэ-

**Уладзімір Макей**

нар. 5 жніўня 1958 у Слоніме Гродзенскай вобл.

У 1980 г. скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моваў. У 1992—1993 вучыўся ў Дыпламатычнай акадэміі МЗС Аўстрыі. Гаворыць па-нямецку і па-англійску. Ад 1980 да 1992 знаходзіўся на службе ва Узброеных сілах СССР. Канкрэтна — у Галоўным разведвальным упраўленні (ГРУ). Палкоўнік запасу.

У 1993—1995 быў трэцім сакратаром упраўлення інфармацыі і гуманітарнага супрацоўніцтва, другім сакратаром аддзелу аналізу і прагназавання, другім сакратаром сакратарыяту Міністэрства замежных справаў Беларусі. У 1995—1996 працаваў намеснікам начальніка Службы дзяржаўнага пратаколу МЗС.

Ад 1996 да 1999 — прадстаўнік Беларусі пры Радзе Еўропы, саветнік Пасольства Беларусі ў Францыі, ад 1999 да 2000 — начальнік упраўлення агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва Міністэрства замежных справаў.

З сакавіка 2000 — памочнік прэзідэнта Беларусі.

З ліпеня 2008 — кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта.



Выхавацель. З Віктарам Лукашэнкам і ягонай жонкай на прэм'еры «...Чорнага ката».

ба вышкаліць. Трэба навучыць хлопца быць высокапастаўленым чыноўнікам — і не фанабэрыцца пры гэтым, разумець сваё месца ў прэзідэнцкім апараце. Вось гэтым і займаўся Уладзімір Макей, які стаў да пачатку ўсёй гэтай гісторыі фактычна першым памочнікам кіраўніка дзяржавы.

Мяркуючы па ўсім, у Віктара была да гэтага схільнасць. Адбілася жорсткая бацькавая рука. Пазбаўлены ў дзяцінстве шмат чаго з таго, што было дазволена яголым аднагодкам, Віктар Лукашэнка і ў ролі сына прэзідэнта — прынамсі, як распавядалі людзі, якія ведалі яго падчас працы ў МЗС, — паводзіў сябе не так абуральна, як, скажам, Андрэй Юшчанка. Прынамсі, пасля заўвагі міністра, выказаной «наагул» пра тое, што шараговыя супрацоўнікі загароджваюць дарогу да міністэрства сваімі аўтамабілямі, Лукашэнка малодшы пачаў пакідаць машыну за два кварталы ад МЗСу і далей ішоў пехатой. Не бог ведама які ўчынак, але ж і правы качаць не стаў.

Макей выявіўся добрым выхавальнікам. Ён не здолеўператварыць сына прэзідэнта ў публічнага палітыка — ды такой задачы ніхто перад ім і не ставіў. Але ён навучыў Віктара апаратнай рабоце, уменню чытаць паперы і граматна падаваць іх змест, уменню ладзіць з людзьмі і сыходзіць ад канфліктаў. Гэта не замяняе адукацыі, але дазваляе ўпісацца ў калектыў і стварыць уласную «каманду».

Так узнік, урэшце, міф пра «каманду ваўчанят».

### ...lupus est. Нелірычнае адступленне

Былі калісьці ў беларускай палітыцы «маладыя ваўкі». Адзін з іх стаў важаком зграі, што ўзяла пад кантроль пушчу.

Але пераможцам стала цесна. Хтосьці з ваўкоў загінуў у барацьбе, хтосьці падох сам, захлынуўшыся слінай. У кагосьці хапіла розуму перабрацца далей ад схваткі, а хтосьці наагул сышоў з ваўкоў. І калі воўк-пераможца адчуў стому, побач не аказалася анікога з аднагодкаў. Засталіся толькі маладыя ваўчаняты, выгадаваныя пад яголым кіраўніцтвам, якія чакаюць, калі ён канчаткова знямогжацца і адыдзе ўбок. Каб потым падзяліць здабычу.

Шчымлівы міф. Праўда, рэчаіснасць не менш шчымлівая.

Ваўчанятаў не было. Воўк — жывёла вольная, драпежная. Суперніка можа і разарваць. А ў нашым выпадку супернікі ўжо даўно былі прыбраныя. Ваўка атачылі шакаляняты, звыклыя дабіваць ужо параненага. Яны нават у схватку не былі здольныя ўступіць.

Такая псіхалогія чыноўніка. Удумайцеся ва ўсё тое, што мы ведаем пра тых, каго часам называюць «ваўчанятамі». Мы ведаем толькі, што яны дружна рвуць на шматкі тых, ад спрыяння якім і без іх адмовіўся прэзідэнт. І толькі ў тым выпадку, калі ён ім гэта дазволіў. Ваўкі так сябе не паводзяць.



PHOTO.BY.MEDIA.NET

**Здольны весці перамовы з Захадам. На фота: з прафесарам Райнерам Ліднерам (злева) і паслом Гебхардам Вайсам (справа) на «Мінскім форуме».**

Воўк — публічны палітык лесу.

«Палітбюро» — тое вузкае кола службовых асобаў, да чыёй думкі ў той ці іншы момант прыслухоўваецца прэзідэнт — у нас карэнным чынам перафарматавалася тройчы.

Першы раз яго сфармавалі пераможцы. Каманда 1994 году і Мясніковіч, які да іх далучыўся.

У другі раз абвясцілі «набор», калі канчаткова сышоў давер да «старых паплечнікаў» — да тых, хто атачаў мацёрага ваўка у час ягонага трыумфу над пушчай. У той момант нагнулі Канаплёва, змусіўшы змірыцца з паўторным абраннем на пасаду віцэ-спікера; выціснулі з Рады Бяспекі Шэймана, дружнымі высілкамі дагрызлі ўплыў «заўгаса рэспублікі» Ціцянкова. Затое ўсплыла «акула» Жураўкова, надзьмуліся ўплывам «маладатуркі» Тозік і Сідорскі, хітрамудры Латыпаў выйшаў з ценю, дый Шэйман вярнуўся ў рэальнае «бліжняе кола» — як супрацьвага «маладатуркам» і Латыпаву.

У трэці раз — апынулася паза бортам улады Жураўкова, вылецеў у Пекін Тозік, саслабеў Сідорскі, сам здолеў сысці Латыпаў. Дацiснулі Канаплёва, пазбавілі ранейшага ўплыву Шэймана. Самай публічнай асобай трэцяга складу «Палітбюро» стаў Макей. Не новым тварам стаў, паўторым, — проста іншым тварам. Другім тварам — адначасова.

Выявілася: у рэжыму ёсць людзі з разумным і зусім не стальным поглядам. Якія ведаюць мовы, размаўляюць на іх цвёрда, але без латыпаўскай «чэкісцкай» запінкі і без антановіцкага камуністычнага душку. Здольныя весці перамовы з Захадам — і якія карыстаюцца пры гэтым нейкім незразумелым уплывам на прэзідэнта.

Лорд Бэл? Гэта тытул. Пусты ў дадзеным выпадку. Ніякі лорд ніякаму Лукашэнку парадаў па вызначэнні даць не можа — беларусы ўсё-ткі не англічане. Імя, прозвішча нашага не-лорда не-Бэла — Уладзімір Макей. Вось сёння галоўны перамоўца беларускай кіроўнай эліты, які памятае, што Страсбург — гэта ў Эльзасе, а таму шлях туды ідзе праз Германію і Францыю. Вось чалавек, які стварае новы імідж беларускай улады, дапамагаючы Аляксандру Лукашэнку (дапамагаючы — не болей!) адрулiць далей ад небяспечных расійскіх віроў. За семнаццаць гадоў суверэнітэту ён выгаварыў сабе

**«Кадравую рэвалюцыю» правесці — вось галоўнае прызначэнне Макея ва ўладзе.**

месца ў кіроўнай эліце, сумленна яго заслужыў і цяпер адстойвае права захаваць для сябе гэты статус. Бо ў саюзнай дзяржаве — кім ён будзе? Кім ён будзе у Расійскай Імперыі? Нікім. Як дырэктар непаспяховага саўгасу «Гарадзец» стаў прэзідэнтам і зусім не збіраецца развітвацца з сваім статусам, так і Уладзімір Макей ніяк не збіраецца ператварацца ў правінцыйнага дыпламата, што чакае, пакуль які-небудзь расійскі дыпламатычны бонза зробіць ласку прызначыць яго восьмай асобай ў амбасадзе Расіі ў Кыргызстане. Эліта, што прыходзіць да ўлады ў сваёй краіне, пра інтарэсы іншых краін думаць перастае — такі закон палітыкі.

### Макей і два партфелі

Але воўк стаміўся. Трэба быць побач з ім, падтрымліваць яго ў рашучасці абараніць, адстаяць сваю пушчу ад вельмі дарагога саюзніка. Так Макей быў змушаны спалучыць пасаду кіраўніка Адміністрацыі, якая дала яму неабходныя адміністратыўныя паўнамоцтвы, з ранейшай пасадай дарадцы прэзідэнта. Таму што нікому іншаму даверыць права вызначаць графік сустрэчаў прэзідэнта ён не можа. Латыпаў знайшоў калісьці свайго Макея. Ці будзе новы памочнік валодаць адным з галоўных прынцыпаў свайго патрона — ці будзе ўдзячны яму за вылучэнне?

Гэтая двухсэнсоўная двухпартфельнасць Макея шмат у чым аслабіла ягоную рэальную ўладу ў дзяржаўным апараце. Ён можа шмат — але не ўсё, яму дадзены карт-бланш — але ён кідаецца паміж вырашэннем дыпламатычных і кадравых праблемаў. Добра: удалося паставіць адносна маладога тэхнакрата на сталічную, Магілёўскую вобласць. Ну а ў Пекін на фіга лётаць? Тозіка ўгаворваць вярнуцца, ці што? Дык тут за гэты час багата вады сплыло, шмат кадраў не прызначана. Часу няма. Не хапае на ўсё часу.

«Кадравую рэвалюцыю» правесці — вось галоўнае прызначэнне Макея ва ўладзе. Перафарматаваць дзяржаўны апарат так, каб ён нармальна функцыянаваў ва ўмовах крызісу — то бок перавесці з рэжыму «ручнога кіравання» ў рэжым «самазаводу». Але для гэтага трэба мець сур'ёзны рэзерв, а не спіс паслухмяных чыноўнікаў. Абапірацца можна толькі на тое, што аказвае супраціў. А пластылінавыя чыноўнікі растаюць, апынуўшыся паблізу ад вельмі гарачага, нягледзячы на відавочнае затуханне, агню прэзідэнта.

Макей апынуўся з паўнамоцтвамі — але без рэальнай магчымасці іх рэалізаваць. Колькі ні тасуй старую калоду, казырнога туза не выцягнеш. Ён у адбоі. Трэба пачынаць гульню наноў... А вось на гэта якраз і няма паўнамоцтваў. Такое рашэнне прымае толькі першая асоба — адзіная сапраўдная асоба ўлады. І другая асоба патрэбная першай толькі для вырашэння неадкладных тактычных задачаў. Трэба пагутарыць з замежнікамі? «Уладзім Уладзімыч, пагутарце са спадарамі...» Патрэбная парада па кадрах? «Хто там у нас гатовы заняць пасаду?..» Але рашэнні прымае не ён.

Ён, Уладзімір Макей, застанецца разумным чалавекам з моцнымі нервамі, жывым поглядам і якімі-ніякімі, але прынцыпамі нават у выпадку адстаўкі. Гэта шмат. З такім багажом можна з'ехаць у любую сталіцу Еўропы ў якасці пасла — прычым пры любым рэжыме. Але замяніць сабой рэжым, змяніць яго нягнуткую, жорсткую, нетрансфармабельную структуру ён не здолее, нават калі шчыра гэтага жадае. Вось разагрэў ён крыху глыбы лёду — але стукне мароз памацней, і беларуская палітычная адліга скончыцца так жа хутка, як і пачалася. Трэба толькі, каб цэны на нафту былі вышэйшымі, а на газ — ніжэйшымі. І «бацька беларускай палітычнай адлігі», як ужо пасьпяшаліся назваць Уладзіміра Уладзіміравіча ў адной з заходніх газетаў, рызыкуе паслізнуцца на новаўтвораным ледавіку — і ...

Будзем яму ўдзячныя. Кароткая адліга ўсё адно лепшая за бясконцую зіму. Яна дае надзею.

**Аляксандр Фядута,**
**спецыяльна для «НН»**



# Вербніца

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вербніцу адсвяткавалі беларускія каталікі. За тыдзень — Вялікдзень**

## Паляўнічыя на галовы

Абязлюдзелі вёскі, развялося звяр'я...

Звяроў цяпер у лесе — страх. Людзей у вёсках мала, гаспадаркі занепадаюць, меней тэхнікі. Дзікі на калгасную бульбу выходзяць статкамі па пяцьдзесят галоў. Казуляў многа (у нас яны завуцца проста «козы» і «казлы»), трапляюцца ласі, сталі забягаць ваўкі, якіх дваццаць гадоў не было.

Да нас прыязджаюць палязваць багатыя людзі з Расіі. Купляюць ліцэнзію, але, як заваляць лася ці дзіка, дык мяса не бяруць. Бяруць адну галаву ці іклы — на сцяну павесіць.

Раз пайшлі мы з адным такім паляўнічым па галовы на дзіка. Уначы прывёў яго на сцежку, кажу — лезь на вышку, бяспечней з вышкі страляць. А ён захацеў з зямлі, у яго ружжо саліднае было — з спецыяльнай трыногай. Проста на сцежцы стаў. Сам я ўзлез на вышку: няма дурных! Кабан адзін высунуўся, ён стрэліў, але пэўна не пацэліў. Дык на яго ўвесь статак з перапуду шухнуў. Ледзь чалавек паспеў адскочыць. Пасля як пагледзелі — ні ружжа, ні трыногі: усё ў зямлю ўтапталі за 16 м. Так і паехаў чалавек без дзічынай галавы. Добра, што свая засталася цэлая.

**Ляснік З., Мядзельскі раён**

## Як жыць?

Мы ўдваіх з жонкай інваліды другой групы. Дапамогі ад дзяржавы няма, толькі маем ад чыноўнікаў і вертыкалі адну брахню і прыніжэнне з пагрозамі.

Пішу вам упершыню, бо да 2009 году я не ведаў, што ёсць такая газета «Наша Ніва». І калі вы атрымалі дазвол на распаўсюд, я пайшоў на пошту і стаў патрабаваць, каб «НН» прыходзіла для чытачоў у вольны продаж на Парыцкае аддзяленне пошты. Мне на пошце сказалі, што на аддзяленне пошты мы ў вольны продаж такую газету не можам атрымліваць, толькі па падпісцы, і так я з 2009 году стаў адданым вашым чытачом з распаўсюдам газеты іншым людзям.

Жывем мы ўдваіх з жонкай. Абое інваліды другой групы. Дапамогі ад дзяржавы няма, толькі маем ад чыноўнікаў і вертыкалі адну брахню і прыніжэнне з пагрозамі.

Жонка — ветэран працы з стажам 45 гадоў. 35 гадоў працавала ў Парыцкай бальніцы на пасадзе сястры-гаспадыні і санітаркі, а цяпер на прыём да доктара, падаючы, чакае чаргі...

Сам я з 1936 году нараджэння, памятаю ўсю вайну. Вывезлі нас тады з хутароў, бо немцы лічылі, што мы хаваем партызан. Завезлі пад Бабруйск у в.Панкратавічы. Сагналі шмат людзей, загналі ў сарай, абклалі саломай і хацелі паліць. Раптам пад'ехала легкавая машына, з яе выйшаў афіцэр і па нямецку даў каманду выпусціць людзей з сараю. Быў голад, тыф... Я хадзіў да немцаў прасіць хлеба, мяне моцна збіў адзін мадзяр. Адзін раз схапілі мяне ў Краснабярэжскі лагер для адбору крыві для салдат фюрэра... Як толькі жывы застаўся...

> І вось у мяне, пацярпелага ад ЧАЭС, у сакавіку 2009 году з пенсіі вылічылі 66 тысяч рублёў!

Пасля вайны дабраліся з маці да свайго хутару. Жылі ў зямлянцы. Збіралі жалуды, лебяду, крапіву, а летам ягады, грыбы. Аралі на сабе, вашывыя, брудныя. Але ж як дапамагалі людзі адзін аднаму!

А цяпер мяне родная дзяржава зрабіла інвалідам, рабом і быдлам. Я інвалід, пацярпелы ад Чарнобылю, па артыкуле 18: захворванне, па вызначэнні Гомельскага МРЭК, выкліканае ў сувязі з чарнобыльскай катастрофай (як ліквідатар, які неаднакроць накіроўваўся на ліквідацыю наступстваў аварыі на ЧАЭС у Брагінскі і Нараўлянскі раёны, дзе атрымаў дозу з інваліднасцю з стратай 80% здароўя).

І вось у мяне, пацярпелага ад ЧАЭС, у сакавіку 2009 году з пенсіі вылічылі 66 тысяч рублёў! Гэта прытым, што на лекі цэны завоблачныя — дух затыкае і сэрца спыняецца. Калі я пазваніў спытаць, на якой падставе такі грабёж, мне адказалі — у сувязі з падзеннем заработнай платы.

Звярнуўся я і ў Беларускі Хельсінскі камітэт — анічым не памаглі.

І што ты дакажаш, калі ўсё як з панскай рукі даюць? У Беларусі сістэма пабудавана на брахні і гнёце. Але іх пацеха можа абярнуцца страхам і слязьмі для іх саміх, бо няма ўжо сілы больш цярпець такое бяспраўе для простых людзей.

**Павал Давыдзенка, Парычы (Светлагорскі раён)**

## Бачыць вока, ды праўда далёка

Пасля вайны нікому і ў голаў не прыйшло б варагаваць з суседзямі-латышамі.

На ТБ паказалі сюжэт, зняты маскоўскімі тэлевізійнікамі ў нашай Расіцы падчас традыцыйнага памінальнага фэсту па ахвярах Асвейскай трагедыі. Кароткі абразок гутаркі з мясцовай жыхаркай, дзе яна двума словамі засведчыла, што «нас палілі латышы», паслужыў рэпарцёру нагодай для высноў, якія без нацяжкі можна назваць інсінуацыямі. Дзіўна, як не заўважыў аператар магутнага гмаху Расіцкага касцёла. Больш за тое, рэпарцёр паведаміў гледачам, што латышы спалілі касцёл.

Але ж гэта не так. Іншая справа, з храму былі скінутыя вежы — яшчэ ў 1935 годзе іншымі вандаламі. Пасля вайны гмах святыні стаяў адзін на папялішчы мястэчка. Ён стаў першым прытулкам для ацалелых расічан — быў і канторай, і школай, і жытлом, а як пабагацелі, дык ператварыўся ў сховішча ядахімікатаў, страціў дах, вырасціў на сценах маладыя дрэўцы і да нашага часу, мо, зусім бы разваліўся, калі б не перабудова. Зараз з Боскай дапамогай храм вярнуўся да жыцця.

Але затое вока аператара заўважыла рэшткі царквы на далёкай ускраіне вёскі, у былых Трыбісах. Пададзены пад тэкст аб злачынствах «латышоў» (а не латышскага паліцыйнага батальёну) вобраз мусіў, відаць, засведчыць, што латышы грамілі праваслаўныя святыні. Хоць і царкву разбурылі ў 1935-м.

Пасля тэлеперадачы верхнядзвінцы дзяліліся адзін з адным здзіўленнем ад пачутага і ўбачанага. Вось так ТВ прыстасоўвае рэальнасць пад патрэбы палітычнага моманту.

У нашым памежжы ўсе вёскі — «вогненныя». У адным Верхнядзвінскім раёне былі знішчаныя разам з усімі жыхарамі або іх часткай 305 вёсак! Расправу над безабароннымі мірнымі жыхарамі шмат якіх паселішчаў чынілі фашысты з латышскага паліцэйскага батальёну. Але нікому і ў голаў не прыйшло б варагаваць пасля перамогі з суседзямі-латышамі. У латышскіх сем'ях асвеякі, дрысенцы і расонцы ратаваліся ад голаду і холаду, пакуль не пабудавалі свае хаты, у Латвію хадзілі жабраваць і зарабляць на кавалак хлеба, адтуль неслі ў торбах такія дарагія зярняты на першую сяўбу. На хутарах нянчылі латгальскіх дзяцей беларускія дзяўчынкі. А як трохі акрыялі, пайшлі ў былыя кардоны на вячоркі, пайшлі да споведзі ў іхнія касцёлы. Не было выпадку, каб на вячорках нашы хлопцы пабіліся з латышамі. Сваталіся паабапал зніклай граніцы, раячыся толькі з сваімі сэрцамі, а не кіруючыся нейкай помстай. Вядома ж, былых паліцаяў-фашыстаў на вячорках не было. Ды і наогул не чувалася, каб хто-небудзь з іх пасля вайны вярнуўся ў тыя мясціны, дзе прадаў душу д'яблу.

**А.Буры, Верхнядзвінск**

## Яшчэ пра рэканструкцыю Купалаўскага тэатру

**Калі «шматлікія праблемы тэатру», якія, безумоўна, існуюць, будуць вырашацца шляхам узвядзення суперсучаснай прыбудовы, то абавязкова ўзнікнуць праблемы новыя.** Спалучэнне розных па стылі збудаванняў пашкодзіць выгляду Купалаўскага, парушыць ансамбль невялікага скверу.

Як незвычайна выглядае цяпер лёгкі прыгожы будынак тэатру з боку праспекта і плошчы! Амаль такім бачылі яго некалькі пакаленняў мінчукоў...

Мне здаецца, сур'ёзна трэба падумаць аб стварэнні НОВАЙ СЦЭНЫ Купалаўскага, з абавязковым захаваннем гістарычнай, а магчыма, і малой.

Тры сцэны: старая, новая, малая. А што датычыць месца будаўніцтва... Тэатр на плошчы выглядаў бы больш натуральным, чым гатэль. Галоўнае — «сем разоў адмерاць» і рабіць усё з любоўю і павагай да папярэдніка.

**НМ, mail.ru**

## Не даюць жыцця дзіцяці!

**Во такую чытацкую рэакцыю на форуме сайту nn.by выклікала новая, трэцяя за апошні час, паездка кіраўніка Беларусі да прэзідэнта Расіі**

Эт, узялі завядзёнку!
Не даюць жыцця дзіцёнку:
Раскладзе ён цацкі ледзьве —
Трэба з таткам да Мядзведзя.

Бо без Колі наш Алесь
У апошні час не ўвесь.

**Кнехт, nn.by**

## Цецерукі такуюць — вясну чуюць

**На верасовых пустках Баранавіччыны напоўніцу такуюць цецерукі.** Характэрнае для гэтых птахаў балбатаньне й фырканьне чуваць у золкавай цішы ледзь не за кіламетр. Бо чалавека бліжэй як на 150 – 200 метраў птушкі не падпускаюць.

**Алесь Гізун, Баранавічы**

# МОЎНЫЯ ДРАБНІЦЫ

## Іншамаркі

У адной дзяржаўнай нацыянальнай газеце ёсць загаловак: «Продаж новых іншамарак у Беларусі пачне павялічвацца да канца 2010 году». Ох, гэтыя прагнозы і прагназісты!.. Але мяне зацікавіла, што такое іншамарка, ці з'яўляюцца іншамаркамі аўтамабілі «Запарожац», «Волга», «Масквіч»?

Постімперскі сіндром вельмі жывучы. Для многіх па-ранейшаму «Наша Родина — СССР», а «Москва — столица нашей Родины».

Мабыць, нашы продкі лепш адчувалі адрозненьне паміж Руссю і Масквой, паміж Літвой і Масквой.

## Што робяць з выбрыкамі?

У адным з мінулых нумароў «НН» чытаю: «...Еўропа пакуль што праглынула новы выбрык Лукашэнкі».

Пігулку, пілюлю глытаюць, а вось выбрык... Выбрыкі церпяць.

**З электроннай рассылкі Анатоля Сідарэвіча**

# Балдук mon amour

Лынтупшчына — край Блакітных азёр, паганскіх капішчаў, фантастычных краявідаў. У вёсцы Вайшкуны жыве ўнікальная калонія мастакоў. І на кожным кроку тут — «французскі след». Піша **Павал Касцюкевіч**.



Калі хочаце нармальна адпачыць, не едзьце на Нарач. Там усе берагі абседжаныя рыбзаводам, прэзідэнцкай дачай і масай турыстаў. Кіруйце, дарагія аматары спакойнага і гарманічнага адпачынку ад Нарачы на паўночны захад, дзе на самай мяжы з Пастаўскім раёнам вас будзе чакаць возера Балдук і яго драбнейшыя калегі па клубе Блакітных азёр.

Як скінуць вокам — непарушная гладзізна. Саракаметровую глыбіню вока не асягае. На берагах — вёскі Станчукі і Вайшкуны. Вёскі маленькія, карэнных жыхароў пару чалавек, але цяпер тут розрух: будуюць лецішчы. Беларускі актор і галоўны расійскі дальнабойшчык, Гасцюхін, напрыклад. Ды што там — кажуць, нават кароль Жыгімонт Стары меў тут сваім часам паляўнічы дамок, а вёска — гіпатэтычная радзіма яго прыдворнага блазна Станчыка.

### Дварчаны — радзіма Кусто

Такая блізкасць і колькасць водных глыбіняў ну проста не маглі не спарадзіць асобу, з вадой непасрэдна звязаную. Мала хто ведае, што з недалёкіх Дварчанаў вядзецца род славутага даследчыка акіяну Жака Іва Кусто. Там дагэтуль жывуць яго сваякі. Колісь бацька Жака Іва, мясцовы селянін, падаўся гастарбайтараваць у Францыю: там пабраўся з француджанкай, нарадзіў хлопчыка, дадому так і не вярнуўся. І яго сын ведаць не ведаў пра свае беларускія карані, але ў тастаменце наказаў адвакатам шукаць усіх сваіх крэўнікаў. Адвакаты сумленна знайшлі ў далёкай Беларусі стрыечную сястру Жака Іва, дачке брата яго бацькі. З характэрным прозвішчам Куст. І вось у элегантных гарнітурах пры дарагіх машынах парыскія адвакаты грукаюцца ў дзверы дварчанскае хаты.

«Баба да акна: глядзіць, нейкія бандыты прыехаўшы, відаць, забіць хочуць, — тут дамо слова краязнаўцу Алесю Гарбулю: мясцовыя канчатак на -ўшы надаюць гісторыі непаўторны прысмак баладнасці і эпічнасці. — Адвакаты пастаяўшы-пастаяўшы ды ў сельсавет пайшоўшы. Спытаўшы, спраўдзілі, што гэта тая самая бабка. Разам з старшынём назад пайшоўшы да бабінай хаты. Бабка няма чаго рабіць — дзверы адчыніўшы. Але грошай не ўзяўшы: «Не ведаю ніякага француза, у нас сваіх Кустоў — поўная хата, і грошай вашых браць не буду, бо, барані Божа, ён яшчэ сюды прыплыве і назад іх спагоніць». Сваякі, кажуць, кусалі локці, але што ты будзеш рабіць... Куст — упартая расліна.

### Калонія мастакоў у Вайшкунах

Колісь скульптар, аўтар Звона Свабоды Алесь Шатэрнік, натхнёны мясцінамі і краявідам, «што кліча плённа пачынаць свой дзень», купіў тут участак. Заахвоціў і сяброў.

«Шатэрнік і К» бурaць усякае ўяўленне пра мастакоўскую калонію. Ніякіх скульптур і мальбертаў па падворках. Бульба расце. Скульптуры ж свае яны ставяць па ўсім краі. Адваёўваюць у няпамяці прастору. Як той вялізны крыж з Пагоняй і надпісам «За нашу і вашу волю» на старажытных лынтупскіх могілках. Помнік беларускім і літоўскім жаўнерам дывізіі Жалігоўскага, што загінулі тут у 1920-м, паўстаў дбаннем Алеся Гарбуля, а таксама мастакоў Стэфана Казлоўскага і Алеся Цыркунова.



Крыж памяці жалігоўцаў з Пагоняй.

Побач з селішчам Шатэрніка, прынаджаныя харaством прыроды, будуюцца «новыя» беларусы і літоўцы. Наймаючы мясцовых жыхароў. «Іван? Ваду знайшоў? Два ж два тыдні капаеш», — крычыць Алесь у дзесяціметровае зеўра, вырытае побач з домам-палацам. «Пакуль не», — чуецца з-пад зямлі. Мо і добра, што бацька Жака Іва ў свой час з'ехаў у Францыю. Дварчанскаму хлопцу Якубу Яну з ягонай цягай да вады, пэўна, давялося б збрацца студнякопам.

### Лынтупы

Лынтупы — мястэчка развітае. Вялізны касцёл, бровар, пункты мытнага афармлення. Штуршком да развіцця стала падвядзенне да яго першай у Расійскай імперыі эксперыментальнай вузкакалейкі. Гэтага праўдамі і няпраўдамі дамогся галоўны інжынер расійскай чыгункі і ўраджэнец Лынтупаў Баляслаў Ялавецкі. Кажуць, быў і камерцыйны інтарэс: чыгунка дазволіла мясцоваму багатыру, пану Бышэўскаму, пабудаваць у Лынтупах бровар і іншыя прадпрыемствы. Таму сёння Лынтупы — не занядбанае сяло. Удзячныя лынтупцы, паставіўшы бюст земляку, на шыльдзе пасля слова «інжынер», праз злучок напісалі «вынаходнік». Так, сапраўды, пан Баляслаў — вынаходнік шэрых схемаў, якія прывялі да росквіту ўвесь край.

І як мястэчку без палаца? Сваімі версальскімі абрысамі лынтупскі палац абавязаны пану Юзафу Бішэўскаму, які пакахаў французскую актрысу і прапанаваў: «Мадам, паедземце са мной у Лынтупы». Акторка запатрабавала, каб там усё стала «на парыжскі манер». Закаханы пан будаваў паляцык, «адзяваў» ставы і ўзбярэжжа ў камень, праз рэчку навесіў лескавы мост, паставіў нават вежу, дзе зрабіў павільён-кавярню... «Так, усё як у Парыжы, — сказала акторка. — Але мне тут усё роўна не падабаецца». І — назад у Францыю. Пасля пан Бішэўскі і не жыў у палацы. За саветамі там размяшчаліся розныя канторы, сярэдняя школа. Цяпер жа — пустыя вокны і друз.

**Лынтупы**
мястэчка ў Пастаўскім раёне на самай мяжы з Літвой. Вядомы з 1459, калі віленскі ваявода А.Даўгірдавіч пабудаваў тут драўляны касцёл. Пры Польшчы — цэнтр гміны. Ад 1939 — у складзе БССР. Захавалася гістарычная забудова мястэчка (канец XIX — пач. XX стст.), касцёл Св.Андрэя, старыя каталіцкія могілкі, капліцы, сядзіба–паркавы комплекс Бішэўскіх (пачатак XX ст.).

**Ну, як без Напалеона?**
500–гадовы дуб ля возера Саранчаны, паводле добрай турыстычнай завядзёнкі, называецца напалеонаўскім. 17 ліпеня 1812 г. Напалеон сапраўды з войскам кіраваў па брукаваным тракце з Гайдуцішак. Дапытлівыя гісторыкі выявілі, што імператар меў–такі гадзінку, каб адпачыць.
У прылежных да Лынтупаў Свірдунах — крыж каліноўцам з надпісам па–польску: «Тут спачываюць парэшткі асілкаў, якія загінулі за свабоду Айчыны ў 1863 годзе».

Гэта не адзіны французскі сюжэт Лынтупаў. У Праспера Мерымэ ёсць навэла «Локіс», у якой абыгрываюцца літоўскія легенды пра мядзьведзя-пярэваратня. Між тым «Вароты Локіса», старажытнае паганскае капішча, месціцца ў ваколіцах Лынтупаў, кажуць краязнаўцы. Дый мясцовыя бабулькі пераказваюць фальклярыстам паданні з падазрона падобным на твор Мерымэ сюжэтам. Выяўляецца, лынтупскі пан Ксаверы Даўгяла пры канцы XIX ст. часта ездзіў у Францыю і быў знаёмы з Мерымэ асабіста. Цалкам імаверна, што Ксаверы мог распавесці яму паданні сваёй радзімы. І апошні довад: гераіня навелы мае прозвішча Даўгяла.

### Радута: капішча Лаймы і жальнік

Хоць самі Лынтупы маюць агромністы, не пашкоджаны войнамі і савецкай атэістычнай сістэмай касцёл, Лынтупшчына — край паганскіх свяцілішчаў. У вёсачцы Радута, дзе вякуе мо найвялікшая ліпа ў Еўропе, ёсць капішча Лаймы, багіні шчасця-ўдачы, беларускай Фартуны. Непадалёк ляжыць каменьахвярнік, расколаты надвое. Кажуць — вынік барацьбы Перуна і Вялеса. Але найхутчэй — хрысціянаў з паганскімі багамі.

Непадалёк — жальнік (старажытныя хрысціянскія могілкі). Курган з надмагіллямі. Урослыя ў зямлю камяні без імёнаў, хіба на дотык адчуваеш ледзь прыкметны крыжык на заімшэлай паверхні. Дбаннем мастакоў тут паўстала разьбяная капліччка-брама. Атрымаўшы такую азнаку, вяскоўцам псіхалагічна прасцей бараніць жальнік ад заезных людзей, чорных далакопаў. Маючы за спінай падтрымку крыжоў на каплічцы, сказаць: «Няможна».

### Агратурызм па-лынтупску

Ужо вечарам трапляем на «Кавальскую сядзібу Трыбуцішкі» Яна месціцца па дарозе з Лынтупаў у Свір. Гаспадар, каваль Юрась Фурс, паказвае нам хату: два пакоі, санвузел з душам, а таксама прыемныя дадаткі — кузня, дзе пад наглядам каваля можна нешта ды і зрабіць, і вясковая лазня. А побач — буслянка з «дзейным» у летні час буслом, рэчка Лынтупка, лясная пастараль і прочая, і прочая, — усе вабноты вясковага адпачынку. А цяпер, шаноўныя, увага: цэны на адпачынак на сядзібе: 50 (!) даляраў у суткі на 4—5 чалавек.

І лічыце апошнія радкі нічым непрыхаванай рэклямай усяго лынтупскага.

А яшчэ кажуць, што ў глыбінях возера Балдук хаваецца пачвара кшталту лахнэскай. Сведчанні тутэйшых традыцыйна пачынаюцца фразай: «Ат, не веру я ў гэтую чудзішчу». А потым ідуць вельмі дэталёвыя апісанні пачвары. «Ну, плавае тут нехта па возеры, — кажуць мясцовыя рыбары. — Ну, з плямістай спінай. Ну, хвост кутасікам. Дык што з таго?». А стары дзед увогуле з нашых роспытаў пасмяяўся: «...Ёсць, ёсць пачвара! У суботу з'яўляецца. Пасля лазні. Пасля пятай чаркі».



# Сланы і насарогі на праспекце Незалежнасці

**Гісторыя стварэння новай беларускамоўнай п’есы «Свабоднага тэатру» магла б сама стаць сюжэтам для дэтэктыву.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

На падмостках аднаго з дамоў у мінскім прыватным сектары на тыдні ішлі спектаклі — «Свабодны тэатр» падводзіў вынікі міжнароднага конкурсу драматургаў. У фінале трохдзённага тэатральнага падполля прайшло чытанне беларускамоўнай п’есы.

Гісторыя стварэння, перакладу і пастаноўкі п’есы «Беларусь» сама магла б стаць сюжэтам для дэтэктыву. Мастацкі кіраўнік «Свабоднага тэатру» Мікалай Халезін кажа, што яе — з 290 твораў з 15 краін свету, дасланых на конкурс — ён атрымаў ад невядомага блогера. Дасылальнік удакладніў, што п’есу напісаў англічанін, які прасіў перакласці твор на беларускую, а потым спаліць арыгінал. Аднак назваць імя перакладчыка або імя англійскага аўтара блогер адмовіўся.

Але ж, як высветлілася, п’еса «Беларусь» за аўтарствам Марка Ледэтэда ў перакладзе Іллі Сіна была надрукаваная ў часопісе «Дзеяслоў» (№5(24) за 2006). У прадмове да публікацыі перакладчык піша, што аўтар п’есы Марк Ледэтэд, «прыязны высокі мужчына пад сорак, знешне зусім не адрозны ад якога-небудзь клерка альбо праграміста», пазнаёміўся з беларускім музыкам Уладам Бубнам у Будапешце, дзе і паказаў яму п’есу. Англічаніна перакананы перакласці яе на беларускую мову. Праз нейкі час Ледэтэд напісаў перакладчыку, што п’еса яму абрыдла, і папрасіў знішчыць англамоўны арыгінал. А таксама не згадваць пра яго аўтарства. Калі па некаторым часе Сін паспрабаваў звязацца з аўтарам, высветлілася, што персанальная старонка англічаніна знікла з сеціва.

Сюжэт п’есы такі: (Не)далёкая будучыня. Двое турыстаў-іншаземцаў, мужчына і жанчына, жыва абмяркоўваюць сваё падарожжа ў Беларусь. У краіне стабільны апакаліпсіс. У Беларусі завяліся сланы і міфічныя пачвары з крыламі і львінымі галовамі, якія стаяць на службе ў беларускіх памежных войскаў. Краіну пастаянна абстрэльвае замежная авіяцыя, але тыя налёты ператварыліся для мясцовых у звыклую рэч. Наагул, шмат чаго ўзвычаенага: прылюдныя расстрэлы паўстанцаў, гвалтаванне жанчынаў. Але менавіта гэта і вабіць турыстаў-фрыкаў: яны захапляюцца Беларуссю, дзе так лёгка можна ўбачыць паганыя для іх карціны смерці і здзекаў.

Нягледзячы на фантастычнасць сюжэту, п’еса поўніцца пазнавальнымі дэталькамі і вобразамі, якія ўзмацняюць эфект уздзеяння. Хоць Ледэтэд і падкрэсліваў, што ў рэальнай Беларусі ніколі не быў, прыдумаць з галавы «вялікія простыя вуліцы, па якіх амаль не ездзяць машыны», «пакручастыя зморшчыны на тварах жанчын, абцягнутых нейкімі адмысловымі хусткамі», «маўчанне чужой мовы», «чыстыя ходнікі і ўрачыстыя маршы», «парады школьнікаў у трыкатажных майтках» і ўрэшце «сланоў і насарогаў, упрыгожаных нацыянальнай сімволікай, што дэфілююць па галоўным праспекце», цяжка было б. Зрэшты, краіна для аўтара — фон, на якім высвечваюцца грамадскія праблемы. У прыватнасці, тая халодная цікавасць, з якой выдуманыя героі згадваюць жахлівыя рэчы, бачаныя ў выдуманай краіне. Зрэшты, ці болей суперажывання выклікаюць рэальныя крывавыя фота з зон рэальных лакальных канфліктаў, якімі апошнія гады поўняцца зборнікі найлепшых здымкаў свету?

«Вы ж ведаеце, які ў нас брак беларускамоўных п’ес, — кажа Халезін. — Асабліва на сучасную тэматыку, асабліва якасных. А «Беларусь» чытаецца, а галоўней глядзіцца, на адным дыху. Вельмі адмысловая п’еса».

**Павал Касцюкевіч**

### МАРК ЛЕДЭТЭД

## Беларусь

(урывак з п’есы)

**Жанчына:** Сівабароды чарнаскуры лодачнік, які пагадзіўся давесці нас да першага блокпаста за нейкія пару даляраў, сарданічна пасміхнуўся і працадзіў скрозь свае ўсцяж пракураныя зубы: вэлкам ту беларусь.

**Мужчына:** Сеўшы на няўтульныя лавы і ўвёртваючыся ад шматлікіх пырскаў, якімі абдавала нас пасля кожнага неасцярожнага ўзмаху вёслаў, мы разгарнулі набыты яшчэ ў Лондане турыстычны атлас. Вуліца Абортаў, праспект Трымцення... Тады гэтыя назвы гучалі так рамантычна.

**Ж.** У атласе было напісана, што самы вялікі гатэль у Мінску мае форму галавы Леніна. Я настойвала, каб мы спыніліся менавіта там. І пажадана ў вобласці вока.

**М.** Тады ў нас было столькі надзеяў! Зрэшты, як і на пачатку кожнага падарожжа.

**Ж.** Але потым вечарынка сканчаецца, і цябе плюшчыць ад канкрэтнага бадуна.

**М.** «Глядзі!» — выгукнула ты, паказваючы рукой кудысьці ў цямрэчу.

**Ж.** Там, у першых золкавых промнях, віднеўся гэты зроблены з малака і бетону свет — свет, пакуль яшчэ новы для нас і таму прывабны. Паднёсшы бінокль да вачэй, можна было разгледзець шырокія простыя вуліцы, па якіх няспешна рухаліся дзіўнай маркі камбайны, статую мясцовага цара, упрыгожаную вялізнай рэкламай чыпсаў «Лэйз», самаўпэўненасць паліцэйскіх, што гвалтавалі якуюсьці дзяўчыну наўпрост на людной узбярэжнай, вясёлыя твары дзетак, якія кружлялі на каруселі...

**М.** Трохі воддаль былі чуваць сполахі стрэлаў гарматаў і кулямётная трасканіна. Відаць, у нейкай частцы Беларусі ішла вайна.

(...)

**З англійскае пераклаў Ілля Сін**

# Кудзіненка здыме

«Беларусьфільм» падпісаў дамову з Андрэем Кудзіненкам, аўтарам паўзабароненага фільму «Акупацыя. Містэрыі», на здымкі стужкі «Масакра». Жанр — гатычная трагікамедыя жахаў. Сюжэт падобны да «Локіса» Праспера Мэрымэ. Месца дзеяння — Беларусь пасля паўстання Каліноўскага. Любоўная гісторыя ў сюжэце таксама ёсць.

Спачатку рэжысёр прапанаваў сцэнар расійскім і польскім кінакампаніям. Але расійскую кінаіндустрыю напаткаў крызіс. Польскім партнёрам спачатку не падабалася «шматмоўнасць» (у фільмах Кудзіненкі героі размаўляюць на мовах, што адпавядаюць іх нацыянальнаму й сацыяльнаму статусу — беларускай, польскай, расейскай. А пасля крызіс накрыў і польскую кінавытворчасць.

У выніку рэжысёр склаў дамову з кінастудыяй, якая ад эканамічнай сітуацыі не залежыць ніяк: з «Беларусьфільмам». Яму абяцалі не чапляцца з ідэалагічнымі прыдзіркамі і фінансаваць шчодра. Запуск карціны прызначаны на восень.

Цяпер рэжысёр збірае каманду. Роля графа, які ператвараецца ў мядзведзя, прапанаваная Анатолю Кату; святаром (і былым паўстанцам) — можа стаць Аляксандр Колбышаў, вядомы, як зухаваты Штыркін з «Акупацыі». Рэжысёр хацеў бы запрасіць здымацца і Лявона Вольскага — на ролю музыкі, і гурт «Троіца».

А перад мастаком карціны Артурам Клінавым пастаўленая задача не толькі намаляваць прыдуманы свет, але і стварыць загадку, якая мае вялікае (і камічнае) значэнне ў сюжэце.

**Андрэй Расінскі**

### КАЛЯНДАР

## Красавік

**1** — Дзень дурня.
**1** — 200 гадоў таму (1809 г.) нарадзіўся Мікалай Гогаль.
**6** — 10 гадоў таму (1999 г.) у мінскай бальніцы памёр Генадзь Карпенка, вядомы палітык, дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га і 13-га скліканняў, мэр Маладзечна.
**10** — Пэсах у юдэяў.
**12** — Вялікдзень у каталікоў.
**12** — Сусветны Дзень авіяцыі і касманаўтыкі. У гэты дзень Юры Гагарын здзейсніў свой палёт у космас. Менавіта праз першага касманаўта ў некаторых заходніх краінах гэтае свята называецца «Ноч Юрыя»/Yuri’s Night.
**19** — Вялікдзень у праваслаўных.
**20** — 175 гадоў з дня нараджэння беларускага геадэзіста Юзафа Жылінскага, даследчыка Палесся.
**26** — Дзень Чарнобыльскай трагедыі.
**28** — Радаўніца.

**Склаў ЛК**

### НОВЫЯ КНІГІ ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Алесь Няўвесь. Частка 2.**

Калі вы любіце «Сказ пра Лысую гару» або «Ідзіот, самы настаяшчы», другая кніга Алеся Няўвеся «Адлуп» — для вас.

Цягам году на старонках «Свободных Новостей» Няўвесь даваў сатырычную справаздачу аб глупствах і палітычных падзеях, якія адбываліся ў краіне. Пра шведскага веласіпедыста, якога абрабавалі ў Маладзечне, пра адмену «залатой акцыі», пра апафеозныя «Дажынкі» ў Оршы, пра незвычайную істоту, якая бегае па беларускіх лясах і вёсках, пра класікаў літаратуры, якіх выкінулі з школьнай праграмы, пра «авіяналёт» на дачны пасёлак побач з «лініяй Сталіна»... Яшчэ памятаеце? Як не, то маеце нагоду прачытаць пра іх у паэтычным пераламленні Няўвеся.




**Алесь Няўвесь.** Адлуп. — Мінск, 2009

Айчынная літаратура пачала сваю адроджаную ходу менавіта з сатырычных вершаваных паэм-фельетонаў, «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат». У краіне, дзе пераход на персаналіі ў фельетоне пагражае крымінальнай справай, а сатырычныя творы па-ранейшаму абгорнутыя ў эзопаву мову баек, гумарыстычныя паэмы маюць сталы попыт. Усё гэта, без усякай сувязі з літаратурнымі вартасцямі самых твораў, наводзіць на пытанне: што, грамадства захрасла ў сваім развіцці ў XIX стагоддзі?

**Лявон К.**

### СЦІСЛА

#### Грандыёзны рок-фестываль

пройдзе 23 мая на адкрытай пляцоўцы аэраклубу «Баравая» (непадалёк ад мінскага Уручча). З фэсту Bela music — 09 з удзелам «Крамы», Neuro Dubel, «Палацу», «Дзецідзяцей» арганізатары хочуць зрабіць «фестываль фестываляў», дзе маглі б сабрацца героі ўсіх музычных прэміяў, што маюць дачыненне да беларускай музыкі. Ідэю падтрымаў Мінкультуры.

#### Новы кіраўнік у БДТ-2

прызначаны 31 сакавіка. Рэжысёр Рыд Таліпаў змяніў на пасадзе мастацкага кіраўніка Тэатру імя Якуба Коласа Віталя Баркоўскага. Рыд Таліпаў — уладальнік Гран-пры міжнародных тэатральных фестываляў. Яго пастаноўкі ідуць у тэатрах Беларусі, Расіі, Аўстрыі, Польшчы.

#### Усе яны запяюць па-беларуску

Інтэрнэт-партал «Тузін Хітоў» і грамадзкая кампанія «Будзьма беларусамі» пачынаюць акцыю «Тузін. Перазагрузка». Самыя цікавыя айчынныя небеларускамоўныя выканаўцы запішуць свае хіты па-беларуску. «Перазагрузіцца» пагадзіліся зоркі беларускай поп-сцэны і альтэрнатыўныя выканаўцы. Усе песні праекту будуць прэзентавацца на сайтах music.fromby.net і budzma.org.

**МБ, БелаПАН, Тузін Гітоў**



**1989 год. Вільня. Устаноўчы з'езд БНФ. У прэзідыюме — Вячаслаў Жыбуль, Зянон Пазняк, Юры Хадыка. Цалкам фотарэпартаж глядзіце ў часопісе ARCHE (№1-2'2009).**

# Код 1989

«Мусіць быць створаны надзейны механізм абароны ад самога кіраўніка дзяржавы, калі яму пачнуць сніцца сны пра Сталіна». Піша **Віталь Тарас**.

Часам у гісторыі за год адбываецца болей кардынальных зменаў, чым за папярэднія дзесяцігоддзі. На нашай памяці такім быў год 1989-ы.

Вось толькі некалькі, найбольш знакавых, падзеяў — першыя ў гісторыі СССР выбары, на якіх вылучаліся некалькі кандыдатаў на адно дэпутацкае месца; першыя паўсвабодныя выбары ў Польшчы, утварэнне рэфарматарскага ўраду Мазавецкага; крывавы разгон намётавага лагеру студэнтаў на плошчы Цяньаньмэнь у Пекіне; падзенне камуністычнага рэжыму ў ГДР, руйнаванне Берлінскай сцяны — сімвалу таталітарызму і падзелу Еўропы; «Аксамітная рэвалюцыя» ў Празе. Расстрэл румынскага дыктатара Чаўшэску і ягонай жонкі.

Радасць вызвалення «з-пад глыбаў» камунізму тады пераважала над трагізмам многіх падзеяў. Але што засталося ад надзеяў на лепшую будучыню за апошнія дваццаць гадоў?

«Салдаты блакавалі падыходы, акружалі грамадзян і білі іх дубінкамі і сапёрнымі рыдлёўкамі, не шкадавалі тых, хто ляжаў там і галадаў, дзяўчат і сталых кабет, дактароў і работнікаў Чырвонага Крыжа, пераследавалі тых, хто ўцякаў, дабівалі параненых, вырываючы іх з рук медыцынскага персаналу, білі работнікаў мясцовай міліцыі, якія, выконваючы свой службовы абавязак, ратавалі жыццё грамадзян.

*Паводле афіцыйных звестак, на месцы трагедыі загінула шаснаццаць чалавек, чатырнаццаць з якіх жанчыны. Самай старэйшай з іх — семдзесят, самай малодшай — пятнаццаць»...*

З выступлення Т. Гамкралідзэ, дырэктара Інстытуту Усходазнаўства АН Грузінскай ССР (са стэнаграмы І з'езду народных дэпутатаў СССР).

*«Зачытваю лозунгі, найбольш пашыраныя па ўсім горадзе і асабліва ў раёне Дому ўраду, у тым ліку на ангельскай мове: «Далоў расійскі камунізм!», «Далоў камуністычны рэжым!», «СССР — турма народаў» (...)*

*Сапёрныя рыдлёўкі былі ў асабовага складу толькі як прыналежнасць экіпіроўкі. Хто-ніхто трымаў у руцэ сапёрную рыдлёўку, бо салдату трэба чымсьці бараніцца».*

З выступлення І. Радыёнава, камандуючага войскамі Закаўказскай ваеннай акругі (тамсама).

### 9 красавіка

Быў момант увесну 1989-га, калі многім падалося, што надзеям на перамены ніколі не збыцца. 9 красавіка савецкія дэсантнікі разагналі ў цэнтры Тбілісі мірную маніфестацыю. Маніфестанты патрабавалі немагчымага —выхаду з СССР. Савецкая імперыя ашчэрыла зубы. Зубы, праўда, былі ўжо гнілыя. Але кроў людская была сапраўднай.

Здавалася, гарбачоўскім рэформам, дэмакратыі пакладзеная мяжа.

Але 23 мая ў Маскве сабраўся першы З'езд народных дэпутатаў СССР. Пачаўся ён з таго, што дэпутат Таўпежнікаў (лекар «хуткай дапамогі» з Рыгі) нечакана, яшэ да пачатку паседжання, выбег на трыбуну і прапанаваў ушанаваць памяць загіблых у Тбілісі. І ўсе дэпутаты, прысутныя ў зале, — у тым ліку сакратары абкамаў, прадстаўнікі найвышэйшай партнаменклатуры, міністры, генералы войскаў і КГБ — усталі. Гэта быў толькі пачатак.

Няма сэнсу пераказваць ход з'езду. Калі сёння перачытваеш выступленне прафесара Юрыя Афанасьева, які кінуў з трыбуны ў твар партнаменклатуршчыкам словы пра «агрэсіўна-паслухмяную большасць», здзіўляешся — чаму абсалютна нармальныя словы ўспрымаліся ў грамадстве амаль як выбух бомбы? Ён жа ўсяго толькі ўслых сказаў тое, што думаў. І пра што думалі яшчэ сотні тысяч іншых людзей, зразумела...

У дні з'езду на вуліцах Мінску часцяком можна было бачыць людзей, якія ішлі альбо стаялі, прыціскаючы да вуха радыёпрымачы. Яны слухалі не рэпартажы з футбольных матчаў, а выступленні Алеся Адамовіча, Гаўрылы Папова, Барыса Ельцына, Андрэя Сахарава, Станіслава Шушкевіча. У 1990-м з яшчэ большай увагай будуць слухаць паседжанні Вярхоўнага Савету БССР, потым — ВС Рэспублікі Беларусь. Многія слухалі прымачы падчас мітынгаў, даючы паслухаць трансляцыю суседзям у перапынках паміж выступамі прамоўцаў на плошчы.

*«Падчас вайны, я гэта назіраў сам, а потым чуў ад іншых, людзі ад страху нечакана ўпадалі ў сон, засыналі. Вакол людзей забівалі, як у беларускіх Хатынях, а чалавек заснуў і спіць. Абарончая рэакцыя арганізму, псіхікі. Вось так адну частку народу па чарзе забівалі ў 1920-я, у 1930-я, у 1940-я гады, а астатнія зануранымі былі ў здранцвенне».*

*«Мусіць быць створаны надзейны механізм абароны ад самога кіраўніка дзяржавы, калі яму пачнуць сніцца сны пра Сталіна»*

З выступлення Алеся Адамовіча (тамсама).

### Вандэя — хто гэта?

У Беларусі не было таго валу публікацыяў, якія выходзілі тады адна за адной у маскоўскіх «тоўстых часопісах». Не так шмат твораў захавалася, так бы мовіць, у шуфлядах сталоў беларускіх пісьменнікаў. З ранейшай забароненай літаратуры падчас перабудовы ці крыху пазней былі надрукаваныя, хіба, толькі «Дзве душы» Гарэцкага, «Запіскі Самсона Самасуя», «У кіпцюрах ГПУ» Аляхновіча, вершы Генюш і Арсеньевай (цалкам іх спадчына не апублікаваная ў Беларусі і дагэтуль)...

Але Беларусь, як цяпер разумееш з адлегласці часу, не была і той Вандэяй, якой яна бачылася многім у 1989-м.

Моц вольнага слова, сапраўды, часам уражвае. Пра Беларусь як пра Вандэю загаварылі праз публіцыстычныя выказванні Алеся Адамовіча. Падчас гвалтоўнага разгону маршу на Курапаты, на Дзяды-1988, людзі скандавалі: «Ван-дэ-я»! Словы гэтыя былі звернутыя не столькі да спецназаўцаў, якія і слова таго не ведалі (некаторыя з іх пыталіся: хто такая Вандэя?!), колькі да камуністычнай улады БССР.

Цяпер мы можам разважаць, што агульнае між Вандэяй і Беларуссю — толькі сялянская большасць у насельніцтве (у нашым выпадку гэта былыя сяляне, гараджане ў першых пакаленнях). І што «белы тэрор» супраць рэвалюцыянераў у французскай правінцыі быў адказам на «чырвоны тэрор» парыжскіх якабінцаў. Але лозунг на нейкі час зрабіўся папулярным. Хаця ў дачыненні да Сакалова (хто цяпер памятае яго імя і пасаду?) і іншых чальцоў ЦК КПБ гэта, хутчэй, было кампліментам. Якога яны, зразумела, не разумелі і не жадалі.

Неаспрэчна, што ў Беларусі адбывалася тады сапраўдная рэвалюцыя. І пачалася яна нават не ў кастрычніку 1988-га, калі адбылася першая ў СССР масавая антысталінісцкая дэманастрацыя і калі супраць мірных дэманстрантаў былі ўжытыя «спецсродкі», а ўлетку.

### (У) моўная рэвалюцыя?

У Беларусі не было сваіх «Московских новостей» ці «Нового мира», але ў яе была і ёсць свая легенда «перабудовачнай» журналістыкі — тыднёвік «Літаратура і мастацтва» на чале з Анатолем Вярцінскім. А зорным часам гэтай журналістыкі сталася, безумоўна, публікацыя артыкула Зянона Пазняка і Яўгена Шмыгалёва «Курапаты — дарога смерці». Нічога падобнага, паводле моцы фактаў пра злачынствы НКВД і глыбіні маральнага ўздзеяння на грамадства нідзе на савецкай прасторы, наколькі мне вядома, да тае публікацыі не было. (Пра моц артыкула ўскосна сведчыць тое, што галоўны рэдактар газеты «Беларусь сегодня» Павел Якубовіч у інтэрв'ю польскім журналістам для кнігі «Зрабаваны народ» сцвярджае, быццам хацеў апублікаваць падобную інфармацыю пра Курапаты, але Пазняк яго апярэдзіў).

Акрамя таго, былі непадцэнзурныя «Навіны БНФ». У 1990-м, дзякуючы Сяргею Дубаўцу, з'явіцца газета «Свабода», у 1991-м адродзіцца «Наша Ніва». «Народная газета» стане газетай Вярхоўнага Савету. І нават «Звязда» адзначыцца «перабудовачнымі» публікацыямі.

Адрозна ад рэвалюцыяў у суседніх краінах Балтыі, у нас гэта не была «спеўная рэвалюцыя». Але беларускую рэвалюцыю канца 1980-х смела можна назваць рэвалюцыяй моўнай. Яна выяўлялася не толькі ў беларускіх вольных выданнях, у з'яўленні цэлай хвалі маладых журналістаў, публікацый філолагаў і гісторыкаў. Мова вольна загучала на вуліцах і плошчах, на мітынгах і дэманстрацыях.

Дык што гэта было ў 1989? Можа, гэта быў усяго толькі ружовы сон, які скончыўся ўсяго праз пяць гадоў? І ўсё ніяк не можам прачнуцца, выйсці з таго здранцвення, пра якое пісаў Адамовіч.

Патрэбны код доступу да памяці. Калі мы яго яшчэ не згубілі.




## ВЫСТАВЫ

### Белая ружа

**У Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Кастрычніцкая пл.) да 30 красавіка** працуе выстава «Белая ружа», прысвечаная студэнцкаму супраціву гітлераўскаму рэжыму ў Мюнхене ў 1942—1943 гг. Выстава расказвае пра дзейнасць нямецкіх студэнтаў-медыкаў, якія распаўсюджвалі антыгітлераўскія ўлёткі ад імя «Белай ружы».

### Аб'ектны жывапіс/ Pittura Oggettuale

**У мастацкай галерэі Універсітэту культуры да 11 красавіка** працуе беларуска-італьянская выстава «Аб'ектны жывапіс/Pittura Oggettuale», якая аб'яднала выпускнікоў італьянскага інстытуту мастацтва Gubbio, Беларускай акадэміі мастацтваў і БДУ (факультэт культуры і мастацтва). Удзельнікі: Самуэле Вентані (аб'екты з джынсу і палатна), Сяргей Ждановіч (фота), Дзяніс Барсукоў і Павал Кастусік (жывапіс) ды іншыя.

### Алтарны жывапіс Беларусі XVIII—XIX стагоддзяў

**У Мастацкім музеі (Леніна, 20) да 23 красавіка** працуе выстава «Алтарны жывапіс Беларусі XVIII—XIX стагоддзяў». На выставе можна ўбачыць 33 творы рэлігійнага жывапісу Беларусі з фондаў музею, многія з якіх выстаўляюцца ўпершыню.

### Мінскі альбом № 1

**Да 20 красавіка ў галерэі «Свет фота» (Прытыцкага, 10)** працуе фотавыстава Валерыя Вядрэніо «Мінскі альбом № 1 (2009)».

### Работы Іларыі Вечар і Дзмітрыя Зайцава

**Да 30 красавіка ў абласной бібліятэцы імя Пушкіна (Гікалы, 4)** працуе выстава твораў Іларыі Вечар і Дзмітрыя Зайцава. Экспазіцыя бацюка Іларыі Вечар носіць назву «Канон». На ёй паказаная калекцыя абразоў, напісаных на аснове іканаграфічнай візантыйскай школы, закладзенай апосталам Луком.

### 200-годдзю Гогаля прысвячаецца...

**Да 14 красавіка ў Нацыянальнай біболіятэцы** працуе выстава, прысвечаная 200-годдзю Мікалая Гогаля. На выставе экспануецца каля 500 выданняў твораў Н.Гогаля, у тым ліку і вельмі рэдкія — ілюстраваная аповесць «Похождения Чичикова, или Мертвые души» (СПб, 1900 г.) з партрэтам Гогаля, гравіраваным на сталі, 10-ю геліягравюрамі і 355-ю ілюстрацыямі мастакоў, і мноства іншых экспанатаў

### Выстава Барыса Аракчэева

**У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (Багдановіча, 7а) да 8 мая** працуе мастацкая выстава Барыса Аракчэева «Мая Яраславія». Мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю Максіма Багдановіча, знайшлі адлюстраванне ў творчасці Барыса Аракчэева. У фондах Літаратурнага музею Максіма Багдановіча захоўваюцца яго карціны — «Гады вучобы ў гімназіі», «Апошняя вясна ў ліцэі», «Дом у Яраслаўлі», «Яраслаўль. Сажалка ў Карабісе. Па сцежках М.Багдановіча».

### Велікодныя падарункі

Выстава-продаж «Велікодныя падарункі» распачнецца **9 красавіка а 15-й у галерэі «Скарбніца» (Кісялёва, 40)**. На выставе: арыгінальныя сувеніры — святочныя атрыбуты. Велікодныя саламяныя яйкі, кошыкі, анёлы, сувеніры для ўпрыгожвання куліча, ручнікі, тэматычныя паштоўкі... Уваход вольны. **Выстава працягнецца да 20 красавіка.**

### Сустрэча з паэткамі

**10 красавіка ў бібліятэцы №12 (Маякоўскага, 164)** адбудзецца творчая сустрэча-імправізацыя з дзвюма маладымі паэткамі — Алёнай Беланожкай і Вікай Трэнас. У вечарыне возьме ўдзел бард Наталля Пушкарова. Спецыяльны госць — музыка, лідэр гурту White Night Blues Юры Несцярэнка. **Пачатак а 16-й.** Уваход вольны.

## ІМПРЭЗЫ



### Кнігапрадавец Адам Глобус

**9 красавіка ад 18 да 19 гадзіны** літаратар, мастак і выдавец Адам Глобус гандлюе сваімі і чужымі кнігамі **ў кнігарні «Логвінаў» (мастацкая галерэя «Падземка», пр.Незалежнасці,43)**. Можна прыдбаць з аўтографам зусім новую яго кніжку PLAY.BY. Таксама ў «Падземцы» гэтым часам праходзіць першая персанальная выстава жывапісу Адама Глобуса «Магма».

### Прэзентацыя кнігі Барыса Клейна

**10 красавіка (пятніца) а 17-й гадзіне ў памяшканні Беларускага ПЭН-Цэнтру (Казлова, 7-101)** адбудзецца прэзентацыя кнігі Барыса Клейна «Недосказанное. Имена».

## КАНЦЭРТЫ



### Томі Эмануэль

**У «Цэнтры» (Кастрычніцкая пл., 1) 11 красавіка** — канцэрт аднаго з найлепшых гітарыстаў свету Томі Эмануэля. **Пачатак а 18.30**

### Вечар джазавай музыкі

**8 красавіка ў «Графіці»** — вечар джазавай музыкі. Бяруць удзел **Л.Крукоўская** і **А.Паршын**. **Пачатак а 19-й**

### Князь Мышкін

**9 красавіка ў Музеі М.Багдановіча (Багдановіча, 7а)** — «Князь Мышкін» і сябры. **Пачатак а 18.30**

### Вечар Фламенка

**10 красавіка ў Тэатры рускага рамансу (Чыгуначная, 27/2)** — Вечар Фламенка. **Пачатак а 19-й**

### Crivia Aeterna: Архаіка і Сучаснасць

**12 красавіка ў клубе «Стэп» (Прытыцкага, 62)** — чацверты міжнародны музычны фэст «Crivia Aeterna: Архаіка і Сучаснасць» — свята для ўсіх аматараў фолькавай, постфолькавай і неафолькавай музыкі. **Пачатак а 17-й**

### Аляксандр Цыганок

**У «Гудвіне» 12 красавіка** — канцэрт беларускага блюзмэна Аляксандра Цыганка і гурт The Shenna.lu Band. **Пачатак а 19-й**

### Беларускі рэпер Vinsent

**15 красавіка ў «Гудвіне» (пр.Незалежнасці, 19)** — Vinsent з прэзентацыяй альбому «Пачатак». **Пачатак а 18-й**

### Неда і JAZZIt All Stars quintet

**15 красавіка ў Палацы Рэспублікі (пл.Кастрычніцкая, 1)** выступіць спявачка Неда, якую называюць «джазавым голасам Літвы», і JAZZIt All Stars quintet. **Пачатак а 22-й. 15 красавіка а 19-й** — яны ж сыграюць **у клубе імя Дзяржынскага (Камсамольская, 30)**

### Моцарт у Оперы

**17 красавіка на сцэне аднаўленай мінскай Оперы** гучыць музыка Вольфганга Амадэя Моцарта ў выкананні калектыву Нацыянальнага тэатру оперы і балету. Будуць выкананыя славутыя Сімфонія №40 і «Рэквіем».

### Рокаш

**14 красавіка ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт «Рокашу». **Пачатак а 19-й**

### Крама

**16 красавіка ў «Графіці»** — канцэрт «Крамы». **Пачатак а 19-й**

## ТЭАТРЫ

### 9 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Іванаў»
**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 10 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

### 11 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Дамскае танга»
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і брадвей»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Музычны тэатр** — «Вясёлая ўдава»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр оперы і балету** — «Стварэнне свету»

### 12 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта (Інтымны дзённік)»
**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Музычны тэатр** — «Дон Кіхот»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна-жабка»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Тэатр оперы і балету** — «Вечар вальсу»

### 13 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Сны аб Беларусі»
**Музычны тэатр** — «Бунт баб»

### 14 красавіка

**Музычны тэатр** — «Лятучая мыш»
**Тэатр юнага гледача** — «Нататкі музыкі-вар'ята»
**Тэатр імя Горкага** — «Трохграшовая опера»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «П'емонцкі звер»

### 15 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Музычны тэатр** — «Ноч у Венецыі»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»
**Тэатр оперы і балету** — «Лебядзінае возера»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

### 16 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр оперы і балету** — «Шчаўкунок»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла ды іншыя»
**Музычны тэатр** — «Севастопальскі вальс»

### 17 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Вольга»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»
**Музычны тэатр** — «Шклянка вады»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Тэатр імя Горкага** — «Перад заходам сонца»

### 18 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Купалаўскі тэатр** — «Апельсінавае віно» (Малая сцэна)
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»
**Тэатр лялек** — «Жудасны спадар Ау»
**Музычны тэатр** — «Трывалы алавянны жаўнерык»
**Музычны тэатр** — «Магія любові»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

### 19 красавіка

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладына»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Дарагія расіяне! Прыміце спачуванні

**Тарас Бульба**

Расія, 2009, каляровы, 100 хв.

**Рэжысёр:** Уладзімер Бартко

**Ролі выконваюць:** Багдан Ступка, Ігар Пятрэнка, Уладзімір Удавічэнкаў, Магдалена Мельцаж, Уладзімір Ільін, Юры Бяляеў, Міхаіл Баярскі, Ада Рагоўцава, Даніэль Альбрыхскі

**Жанр:** Гераічная драма паводле аповесці Мікалая Гогаля

**Адзнака:** 4 (з 10)

На карціну Уладзіміра Бартко «Тарас Бульба» я ішоў у прадчуванні добрага відовішча. Чаго яшчэ чакаць ад сакавітых і яскравых твораў Гогаля? Дый рэжысёр, які паставіў «Сабачае сэрца» і «Ідыёта», зазвычай ставіцца да класікі ашчадна.

Ёсьць дзве версіі «Тараса Бульбы» — 1835 і 1842 году. У рэдакцыі 1835 г., надрукаванай упершыню ў зборніку «Міргарад» і прынятай ва Украіне, няма доўгіх разважанняў пра «рускую зямлю» і праваслаўнага цара. У версіі 1842 г., якая больш даспадобы расійскаму чытачу і ідэолагу, яны ёсць. Абедзве версіі складзеныя рукою Гогаля. То бок, Мікалай Васільевіч, з характэрным для сябе гумарам, шыкоўна разыграў нашчадкаў. Дый «рускае» для ўкраінца і беларуса — гэта спадчына праваслаўнай культуры, нават і Скарынава Біблія Руская. Для расіяніна ж «рускае» — сінонім культурнага набытку сённяшняй Расіі...

Словы пра «святую рускую зямлю» і пра «рускага цара» паўтараюцца ў фільме з безнадзейнаю надакучлівасцю (хоць у Гогаля гэта не сумна). Ворагі-палякі там пазбаўленыя ўсякіх прыкметаў чалавечнасці. Хоць Гогаль прызнаваў за імі і сваю праўду, і свой гонар. Здраднік Андрый — пад бел-чырвона-белым (?!) сцягам. Бартко нават дапісаў аповесць, уклаўшы ў вусны геапалітычных праціўнікаў словы, быццам пазычаныя з расійскіх навінаў: «Яны не людзі!» Выйшла пляскатая агітка.

Не ратуюць карціну нават вочы Багдана Ступкі, які ідэальна пасуе для ролі Тараса Бульбы.

У фільме процьма натуралістычных сцэнаў, якія ўражваюць падрабязнасцю. Гогаль не хаваў жорсткасці тых часоў — але да чытача ставіўся з павагаю. Экранізатары ж не шкадуюць забароненых сродкаў: праколатыя целы, адсечаныя рукі і ногі, кроў і пырскі на ўвесь кадр.

Раскрытая і кананічная для трэшава-эксплуатацыйнага жанру «тэма цыцак», як называюць у інтэрнэце безгустоўную эротыку.

І так — амаль дзве гадзіны: вылізана-вялыя кадры без аніякай душы; натужлівы гераізм пад навязлівую музыку. І спіты Д'Артаньян — Міхаіл Баярскі ў ролі казацкага героя Мосія Шылы.

Дый не ў дэталях справа. Усё напісанае Гогалем — жывое. А фільм выйшаў фальшывы. Гэта тым болей дзіўна, што Уладзімір Бартко — рэжысёр далёка не апошняга эшалону.

Значыць, праблема не ў рэжысёры, а ў агульным стане расійскай свядомасці. У нейкім агульным фоне і змене падставаў.

За Гогалем — нязнішчаная стыхія ўкраінскай мовы, сакавітыя фарбы і жывая душа. У фільме — бяздушна-стэрыльны зык, «правільная» карцінка і закадравы каментар Сяргея Бязрукава ў традыцыях «Брыгады».

За Гогалем — казацкая вольніца, разгул народнае дэмакратыі і ёлкі водар свабоды. За фільмам — скасцянелае чынушанаванне, тысячагадовае рабства і мёртвыя вочы чэкіста, што пільнуюць краіну.




За Гогалем — зваба Імперыі, што была ў зеніце магутнасці і спакусіла ўкраінскага выхаванца Неўскім праспектам. За фільмам — дробная прынцыповасць Івана Іванавіча, які звягліва вінаваціць Украіну ва ўсіх смяротных грахах і не здольны ўсвядоміць уласны камізм.

Дарагія расіяне! Прыміце спачуванні.

«Тарас Бульба» — ужо не ваша гісторыя.

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 13—19 красавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 13 красавіка, панядзелак

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял: 22 серыя
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Курганы»
*Курганы — насыпы над старажытнымі магіламі, «сведкі сівой мінуўшчыны». У Беларусі яны пачалі з’яўляцца яшчэ задоўга да хрысціянізацыі. І хоць шмат якія з іх «раскрылі» археолагі, нават пасля гэтага яны застаюцца для нас таямніцаю.*
**19.05** Канцэрт «Салідарныя з Беларуссю», ч. 2
**19.55** «Восем месяцаў. Вандроўка ў Афганістан», дак. фільм, 2006 г., ЗША
*Сучасны Афганістан застаецца тэрытарыяй праблемаў. Аўтары стужкі праехалі ўсю краіну ад невялікіх гарадоў да сталіцы — Кабулу.*
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**21.45** «Вясельныя клопаты», маст. фільм, рэж. Эдам Шэнкмэн, 2001 г., ЗША—Нямеччына.
*Мэры Ф’ёрэ працуе арганізатаркаю вяселляў. Яна вельмі амбітная, цягавітая, ведае, што трэба рабіць і казаць, каб пераправіць любое вяселле ў сапраўднае відовішча. Але неяк Мэры пазнаёмілася з адным лекарам і адразу закахалася ў яго, пасля чаго ейнае жыццё цалкам змяняецца. Рэч у тым, што яе новае каханне — гэта жаніх на самым важным для яе вяселлі, якое яна мусіць зарганізаваць максімальна добра, каб дасягнуць кар’ерных вяршыняў. Ці ажэніць яна хлопца з ягонаю старою сяброўкаю з коледжу?..*
**23.25** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 10 серыя
**00.10** Аб’ектыў (навіны)

### 14 красавіка, аўторак

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 10 серыя
**19.00** «Восем месяцаў. Вандроўка ў Афганістан», дак. фільм, 2006 г., ЗША
**20.00** Кухня (музычная праграма)
**20.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Маю права (прававаая праграма)
**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.05** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**22.25** Сальда (эканамічная праграма)
**22.45** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 11 серыя
**23.30** YoLife! (моладзевая праграма)
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 15 красавіка, серада

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 11 серыя
**19.00** «Кіно і катлеты», дак. фільм, рэж. Вольга Мікалайчык, 2008 г., Беларусь
**20.15** Беларусы ў Польшчы
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Рэпартэр (публіцыстычная праграма)
**21.40** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Курганы»
**21.50** «Замежныя справы», маст. фільм, рэж. Гэльмут Шлепі, 2003 г., ЗША.
**23.25** Кружэлка (сусветная музыка)
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 16 красавіка, чацвер

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Замежныя справы», маст. фільм, рэж. Гэльмут Шлепі, 2003 г., ЗША.
**19.45** «Без рэтушы»: «Іншае жыццё», дак. фільм, 2008 г.
**20.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.35** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 2 серыя
**22.55** «Невядомая Беларусь»: «Лебядовыя гады», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**23.25** З архіву «Jazz Jamboree»: «Michele Rosewoman New Yoruba», ч. 2
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 17 красавіка, пятніца

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 2 серыя
**19.00** Маю права (прававаая праграма)
**19.15** «Невядомая Беларусь»: «Дарога да пекла. Атрута», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**19.45** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**20.10** Рэпартэр (публіцыстычная праграма)
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**21.30** «Корчак», маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1990 г., Польшча—Нямеччына.
*Фільм Анджэя Вайды не апавядае пра ўсё жыццё Януша Корчака (сапраўднае імя Гэнрых Гольдшміт) — пісьменніка, педагога, сябра дзяцей. Калі не лічыць кароткага даваеннага пралогу, фільм абмяжоўваецца 1940—42 гг., калі Старога Доктара з ягонымі гадаванцамі, габрэйскімі сіротамі, фашысты ўвязнілі ў варшаўскім гета. Адзін за адным ён адкідваў шанцы ўласнага выратавання ды імкнуўся абараніць дзяцей ад лютасці нацыстаў.*
**23.25** «Містэрыя Божае пакуты на Пазнанскай цытадэлі», рэж. Артур Пятроўскі, 2007 г., Польшча, ч. 1
**23.35** «На поўных абаротах», серыял: 5 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 18 красавіка, субота

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**18.40** «Невядомая Беларусь»: «Напрамеяваныя хлуснёй», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**19.10** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** Наша сцэна: канцэрт гурта «Троіца», ч. 1
**20.10** «Паэма веры», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**20.35** Кухня (музычная праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.10** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**21.40** «Як пошуг маланкі», дак. фільм, 2009 г., Беларусь
*Фільм пра Расціслава Лапіцкага — лідэра моладзевага антысавецкага падполля ў пасляваеннай Беларусі, які пражыў кароткае, але яркае, як маланка, жыццё.*
**22.10** Суботні сеанс: «Вакол свету за восемдзесят дзён», маст. фільм, рэж. Баз Кулік, 1989 г., ЗША—Югаславія. У галоўнай ролі Пірс Броснан. 2 серыя.
*Трохсерыйны прыгодніцкі фільм па матывах рамана Жуля Вэрна.*
**23.40** «Супрасльская лаўра», дак. фільм, рэж. Юры Каліна, 2006 г., Польшча
*Манастыр Дабравешчання Маці Божае ў Супраслі ўзнік у XV ст. Заклалі яго беларуская магнаты Вялікага княства Літоўскага, каб пашыраць «грэцкую веру», пісьменства, мастацтва іконапісання і музыкі. Лаўра ў Супраслі пасля Кіева-Пячорскай стала другою лаўраю на праваслаўным усходзе. Найвялікшымі выпрабаваннямі для манастыра сталі прымусовае высяленне царскімі ўладамі манахаў у глыб Расіі ў 1915 г. і разбурэнне нямецкімі войскамі ўнікальнай абароннай царквы ў 1944 г. Ужо 20 гадоў як у Супраслі аднавіўся манастыр, манахі адбудоўваюць царкву, манастырскае жыццё. Цудадзейны абраз Маці Божае прыцягвае тысячы паломнікаў.*
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 19 красавіка, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял: 23 серыя
**19.05** Канцэрт царкоўнай музыкі, ч. 2
**19.35** «Ваўчыная маці», дак. фільм, рэж. Халіна Ачкасова-Казлоўска, 2007 г., Польшча
*Спадарыня Эльвіра дапамагае людзям. Яна немка і ў пасляваенны час шмат зазнала гора ад савецкай улады. Яшчэ тады яна абяцала сабе і Богу, што не пройдзе міма болю дзіцяці, і сёння трымае слова. Спадарыня Эльвіра жыве і працуе ў Калінінградзе, хоць і мела магчымасць вярнуцца ў Нямеччыну. Трэба выбачаць, кажа галоўная гераіня. Выбачыць можна, але забыцца — ніколі. І апавядае пра свой жыццёвы шлях.*
**20.05** Форум (ток-шоу): Цераз галаву народу
*Некалькі тыдняў цягнуўся інтэнсіўны дыялог паміж уладамі Рэспублікі Беларусі і Еўрапейскага Звязу. Аднак высветлілася, што Еўропе зручней проста весці дыялог з беларускім рэжымам, чым нешта рабіць. Ці сапраўды жадаюць вышэйшыя службовыя асобы ЕЗ легітымізаваць рэжым з боку галоўнай еўрапейскай структуры? Беларусь разам з пяцю іншымі краінамі запрасілі да ўдзелу ў праграме Еўразвязу «Усходняе партнёрства». Ад таго, як будуць развівацца падзеі далей, залежыць будучае стаўленне да Беларусі з боку міжнароднай супольнасці, што, сваім парадкам, адаб’ецца на лёсе Беларусі.*
*У студыі «Форуму» праблему абмяркоўваюць беларускія палітыкі.*
**21.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Хрысціянства»
*Цягам вякоў нашыя продкі — ад звычайнага селяніна да князя — усе былі паганцамі. Яны прыносілі ахвяры каменным ідалам, абагаўлялі прыроду, маліліся Вялесу і Перуну. Усё гэта змянілася ў Х ст.*
**21.25** Фільматэка майстроў: «Жэлары», маст. фільм, рэж. Онджэй Троян, 2003 г., Чэхія—Славакія—Аўстрыя.
*Фільм зроблены паводле прозы Кветы Легатавай. Падзеі разгортваюцца на фоне другой сусветнай вайны. Галоўная гераіня — дзяўчына Элішка — вымушана пакінуць горад і хавацца ў горнай вёсцы, у доме землеўладальніка Ёзы. Па нейкім часе ўзаемны недавер праходзіць і паміж імі, такімі рознымі, узнікае каханне. Элішка спазнае вясковыя працу і побыт, людзей, якія, спамінаючы Бога, могуць быць добрымі і жорсткімі, як і сама прырода.*
*Фільм намінаваўся на прэмію «Оскар» (найлепшы неанглійскамоўны фільм), а таксама па 11 пазіцыях на «Чэшскага льва», узяў дзве статуэткі: за найлепшую жаночую ролю і за гук.*
**23.50** «Бульбаны», мультсерыял
**00.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)





# Збяры Кнігарню «Наша Ніва»














ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ




**У кватэры, у якой збіраюцца актывісты Руху за Свабоду, сканфіскавалі ўсю мэблю. Аднак палітыкі ў тым няма: вопіс праведзены «дзеля выканання прысуду прапісанаму ў гэтай кватэры сыну ўладальніцы кватэры — Аляксандру Пыжкову», які быў асуджаны да пяці гадоў пазбаўлення волі за махлярства ў вельмі буйным памеры. Прадавацца рэчы будуць у Гандлёвым доме «Усходні». На фота: лідэр апазіцыі не першы год дзейнічае ў экстрэмальных умовах, таму канфіскацыя мэблі не выбіла яго з каляіны.**

## ЖОРСТКІЯ ЖАРТЫ



**Во так пажартавалі 1 красавіка невядомыя з помнікам Уладзіміру Леніну, што ў Санкт-Пецярбургу на Фінляндскім вакзале. З дапамогай выбуховага прыстасавання ў шынялі правадыра сусветнага пралетарыяту была прабітая дзірка. Акурат 92 гады таму ў красавіку Ленін з калегамі прыбылі цягніком з Нямеччыны ў Расію.**

### Рэкордная для красавіка спёка

5 красавіка ў Беларусі пабіты тэмпературны рэкорд, які трымаўся 63 гады. У Брэсце слупок тэрмометра ўзняўся да адзнакі плюс 22,6 градуса. Ранейшы рэкорд складаў 22,4 градуса і быў зафіксаваны 5 красавіка 1946 года ў Жыткавічах (Гомельская вобласць).

### У Беларусі збудуюць яшчэ 30 Лядовых палацаў

Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі падчас сустрэчы з прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі хакею Рэнэ Фазэлем.

«У канцы году я ўзгадніў з Аляксандрам Лукашэнкам будаўніцтва яшчэ 12 пляцовак у найбліжэйшыя гады», — цытуе яго БелТА.

Прэм'ер адзначыў, што яшчэ некалькі гадоў таму ў Беларусі былі 4 крытыя лядовыя арэны, а цяпер іх ужо 13.

Сяргей Сідорскі нагадаў, што беларуская зборная па хакеі з шайбай уваходзіць у дзесятку наймацнейшых каманд свету.

**МБ**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Ашмяны Віленскай губ.** Горад наш жыве спакойным жыццём без клопатаў, — нашы гарадскія айцы як бы адпачываюць па выбарах у ўправу. Ужо колькі гадоў чутно аб вучылішчы. Пляц пад школу дае горад (на конскім рынку) і грошы на 600 рублёў у год. Жыды адразу даюць тысячу рублёў. Але справа гэтая, здаецца, пахаваная ў гарадскім архіве. Затое турмы маем аж чатыры. І хто хоча пазнаць ашмянскае жыццё, можа судзіць па яго будынках.

**Знаёмы**
**«Наша ніва». №14. 1909**

## Макіяж чаго?!




У адной з мінскіх касметычных крамаў вырашылі перайсці на кірыліцу. Можа, жанчынаў надпіс «МАКІЯЖ ПУПА» не бянтэжыць, бо хто з іх не ведае касметычнага брэнду PUPA, а вось увагу неабазнаных мужчынаў такое прыцягнуць можа: «Мода такая рэч — ніколі невядома: можа, сапраўды нароўні з пірсінгам у яе ўвойдуць нафарбаваныя пупы?»

**ЛК**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5650. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 07.04.2009.
Замова № 1882.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

## АНЕКДОТЫ

Купіў Пуцін «Ніву».
І цяпер ездзіць за ім не толькі картэж аховы, але і картэж аўтамеханікаў і грузавік з запчасткамі.

***

— Піражок будзеш?
— Ага...
— А чатыры?
— Як гэта — піражок А4?

***

**Ён:** Мне цябе моцна не хапае...
**Яна:** Для поўнага шчасця ці для роўнага ліку?

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ЖЫТЛО

**Тэрмінова здам** 2-пакаёвую кватэру ў Серабранцы з выгодамі: мэбля, тэлефон, інтэрнэт, лядоўня, мікрахвалёвая печ, балкон. Вялікія светлыя пакоі. Новая кухня. Нядорага. halla@tut.by. Ала А.

**Прыстойная жанчына** сталага веку (55 гадоў) здыме аднапакаёвую кватэру. Т.: (029) 340-18-25

**Маладая сям'я** здыме 1-пакаёвую кватэру (вул. Валгарадская, Я.Коласа, Лагойскі тракт ці побач). (029) 253-74-01 МТС

### ХОБІ

**Прапануем калекцыю:** бібліятэка, аўдыётэка, філатэлія, нумізматыка, калекцыя значак «Гербы Беларусі», шляхетныя граматы, пошук шляхетнага герба. alesknigi@mail.ru, а/с 195, 220030, Мінск

### БАГАСЛОЎСКІЯ СЕМІНАРЫ

**Запрашаем** на багаслоўска-гістарычныя Біблійныя семінары «Вялікдзень – Пасха: яе сімвалы і значэнне для кожнага» а 19-й у аўторкі ў красавіку ў памяшканні ТБМ імя Ф.Скарыны (Мінск, вул.Румянцава, 13, уваход з вуліцы). Тэлефоны для даведак: (029) 328-56-78, (017) 249-98-38